Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 33 (489) | Субота, 19 кастрычніка 1940 года | Цана 20 кап.

ІДЭЙНАЕ ВЫХАВАННЕ— АСНОВА РАБОТЫ

Літаратура, мастацтва і ўсе галіны соцыялістычнай культуры заклікаены партыяй Леніна — Сталіна дзейсна служыць справе будаўніцтва комунізма, справе комуністычнага выхавання народных мас. Адсюль вынікае асноўнае патрабаванне да кадраў нашай літаратурнай і мастацкай інтэлігенцыі: ідэйна ўзбройвацца, авалодваць марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Авалоданне большэвізмам, вывучэнне законаў грамадскага развіцця, глыбокае засваенне тэорыі марксізма-ленінізма, ідэйная падрыхтаванасць творчых работнікаў абумоўлівае і творчыя поспехі літаратуры і мастацтва.

З боку праўлення і партыйнай арганізацыі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР не было дагэтуль патрэбнай увагі да ідэйнага, творчага і маральнага выхавання членаў саюза — комуністаў і беспартыйных. Творчыя секцыі амаль спынілі сваю дзейнасць. У друку паявіліся недасканалыя, а часам проста ідэйна і мастацка апарочныя творы. Яны своечасова не атрымалі прынцыповай ацэнкі. Крытыкі, нягледзячы на іх бясспрэчны творчы рост, не занялі яшчэ пачэснага, перадавога месца ў літаратуры. У рабоце з маладымі літаратарамі мела месца ці непатрэбная паблажлівасць, ці халодная безуважнасць. У выніку многія дэбюты ў літаратуры амаль не пакінулі следу. Такімі аказаліся мастацка няспелыя кніжкі Левановіча, Рунца, Гейчэ, Нягая ды іншых. Сведчылі яны толькі аб адным — аб няўвазе Саюза пісьменнікаў і Дзяржаўнага выдавецтва да работы з маладымі аўтарамі, у большасці здольнымі, але не валодаючымі ні культурай, ні тэхнікай пісьма. А для літаратуры было-б лепей, калі-б папаўненне яе ішло па лініі не колькасці, а якасці, каб выхад першай кніжкі маладога аўтара знаменаваў сапраўдны прыход у літаратуру новага пісьменніка, а кожны яго новы твор радасна сведчыў аб творчым росце і ўсё большым раскрыцці яго таленту.

Большымі маглі быць творчыя поспехі маладых пісьменнікаў Краўчанкі, Калачынскага ды іншых. Больш плодатворнай магла быць работа па вырошчванню маладых кадраў літаратуры пры належнай увазе да іх ідэйнага, культурнага, творчага выхавання.

А чым, як не адсутнасцю ідэйнага выхавання, тлумачыцца тое, што рад пісьменнікаў старэйшага пакалення, майстроў літаратуры, не дае літаратарам, у першую чаргу моладзі, патрэбнага прыкладу ў распрацоўцы найбольш важных і хвалюючых тэм нашай сучаснасці — эпохі будаўніцтва комунізма — стварэннем поўнакаштоўных, мастацка спелых, сапраўды майстэрскіх твораў аб вялікіх і слаўных справах гераічнага совецкага народа.

Глыбокае разуменне і веданне кожным пісьменнікам жыцця совецкага народа ва ўсёй яго шматграннасці непарыўна звязана з надзённай справай ідэйнага ўзбраення самога пісьменніка.

Новыя вельмі адказныя задачы ўстаюць перад Саюзам совецкіх пісьменнікаў БССР і па выхаванню нядаўна прынятых у рады саюза літаратараў заходніх абласцей рэспублікі.

Адсутнасць належнай ідэйна-выхаваўчай работы, палітычнай і творчай загартоўкі кадраў уласціва і Саюзу совецкіх мастакоў, Саюзу совецкіх кампазітараў, калектывам работнікаў тэатра. Партыйныя і комсамольскія арганізацыі гэтых творчых саюзаў і калектываў зрабілі недапушчальна мала ў сэнсе дапамогі сваім работнікам у авалоданні марксісцка-ленінскай тэорыяй, не аддалі належнай увагі пытанням творчасці, маральнага аблічча совецкага мастака, кампазітара, актора.

Вялікія творчыя задачы вырашаюць работнікі мастацтваў рэспублікі, натхнёныя поспехамі бліскуча прайшоўшай у гэтым годзе ў Маскве дэкады беларускага мастацтва. Пачатак тэатральнага сезона азнаменаваўся ў двух тэатрах — Віцебскім і Рускім — прэм'ерамі п'есы «Крэмлёўскія куранты», спектаклямі аб Леніну. З вялікім здавальненнем адзначае наша грамадскасць поспех народных артыстаў БССР П. Малчанава і Д. Орлова ў распрацоўцы вобраза вялікага Леніна, паспяховую работу народнага артыста БССР А. Ільінскага і маладога актора Ю. Орынянскага над вобразам вялікага Сталіна. Створаны выдатныя, хвалюючыя спектаклі!

Поруч з гэтым нельга не адзначыць крыўднае неразуменне патрабаванняў гледача і адсутнасць адказнасці перад імі у кіраўнікоў Дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнага тэатра, які адкрыў свой сезон прэм'ерай п'есы «Страшны суд». Гэта трывожны сігнал. Бытуе, відаць, яшчэ тэорыя «касавасці», паводле якой «дазваляецца» выцягнуць на сцэну і які-небудзь сурагат. Гэта з новай сілай падкрэслівае неабходнасць большэвіцкай загартоўкі кадраў нашага тэатральнага мастацтва.

Мастакі Совецкай Беларусі — напярэдадні этапнай у гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Яны ствараюць работы на тэмы гераічнай гісторыі і шчаслівага сёння беларускага народа. Новыя творы ва ўсіх жанрах пішуць кампазітары.

Вялікія і пачэсныя патрабаванні прад'яўляе большэвіцкая партыя, совецкі народ да совецкіх літаратараў, да майстроў усіх галін соцыялістычнага мастацтва. Гэтыя патрабаванні павінны быць з гонарам ажыццёўлены сумленнай, натхнёнай творчасцю ў імя і на славу нашай вялікай радзімы, на карысць комунізма.

Ідэйнае выхаванне павінна стаць асновай работы творчых саюзаў пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, калектываў тэатраў Совецкай Беларусі.

П. Панчанка

СТАЛАСЦЬ

Яна ішла з густых бароў,
З някошаных лугоў,
Пакуль я ў садзе жартаваў
З юначкаю-вясной...
І дзіўна бачыць, што сябры —
У шэрагах байцоў,
Што косы мацеры маёй
Пакрыты сівізной.
Я усяго сябе аддаў
Агню вялікіх спраў.
Як быццам небасхіл цяжкі
На плечы мне налёг.
Так налягае летні дзень
На сцёблы тонкіх траў,
Так кветкі шчодра аддае
Сталёвым косам лог.
Я навучыўся разумець
Сяброўскі поціск рук,
Паходных вогнішчаў цяпло,
Смяротны гул баёў.
І сустракаць ля ціхіх рэк
Паходную Зару,
І ў сэрцы беражна расціць
Цяжкія зерні слоў.
Глядзяць каштаны на мяне
І шэпчуць: «Падужэў.
Пасуравеў пагляд вачэй.
Стражэй абрысы губ».
Зямля,
Ты стала для мяне
Радней і даражэй;
І сад знаёмы да драбніц —
Для сэрца болей люб.
Я не сказаў табе «бывай!»,
Сяброўка-маладосць.
Праллецца тапаліны дождж
На лёгкі пыл дарог —
І ты ізноў ідзі у гай,
Ідзі і напявай,
Што шчасце ёсць
І песня ёсць,
Што радасць я зберог.

ХВАЛА ВАМ!

Хвала вам, чырвонаармейскія боты,
Вы служыце службу сумленна і шчыра.
Не страшны мне з вамі пяскі і балоты,
Размытыя гаці, імклівыя віры.

Заўсёды ішлі вы дарогаю простай,
І бор адгукаўся глухім адгалоскам.
Пачуўшы цяжкі ваш упэўнены поступ,
Адважна ўцякалі драпежныя войскі.

Хвала табе, стрэльба мая баявая,
Ніколі ты мне не намуліла плечы.
Ты ворагаў сэрцы наскрозь прабіваеш,
Умела свінцовымі лекамі лечыш.

Ты пільна радзіму сваю маладую
Вартуеш і ўвосень, і ўзімку, і ўлетку.
Я масла табе анічуць не шкадую —
Служы толькі верна, страляй толькі
метка.

Хвала і шынелі, хоць сціплай, ды
цёплай.

Суровая сцюжа мяне не згінала:
Ад дзікіх вятроў, ад асенніх патокаў
Мяне беражліва шынель захінала.

Хвала і табе, кацялок мой паходны,
Ніколі не кідаў мяне ты галодным.
Прыпомні, як мы ля ракі на прывале
За супам наварыстым піравалі.

А зорцы, што зззяе агнём рубіновым,—
Найлепшыя песні, найлепшыя словы.
З табою мне светла і ў цёмныя ночы.
Дзе кінеш ты промень, туды я і крочу.

І людзі спяшаць на нямеркнучы свет
твой,

І чуюць падзяку стагоднія хвоі:
«Ты радасць прынёс нам з краіны
Советаў
І зорку шчаслівую, сталінскі воін!»

АБЫВАТАЛІ

Іхны дом змайстраваны лоўка
Каля мутных спакойных рэк.
Гэблем вылізаныя шалёўкі
Прыкаваны цвікамі навек.

Тут закон — у закут свой цягні ўсё.
Абмяльчэлае племя хапуг!
Душны свет іх даўно загніўся,
Атлусцеў, да брывей запух.

Дні напластваюцца, як копаць,
Без вялікіх трывог і надзей.
Спяць, ядуць і капейкі копяць,
І зайздросцяць шчасцю людзей.

О, яны цябе стрэнуць ветла.
Ты для іх дарагі, ледзь не бог.
Ды з пагардаю непрыкметнай
З галавы агледзяць да ног.

Да касцюма твайго прычэпяцца:
Глупства! Танны зусім тавар.
Распытаюць, ці ёсць хто ў цэнтры,
І гарэбліва скрывяць твар.

І пакуль языкам стане мулка,
Яны сліняць твой выгляд і рост.
А пасля па крывых завулках
Абмінаюць за дзесяць вёрст.

Яны проста не глянуць у вочы,
Усе прыкметы ў іх «не к добру...»
Белізна вышываных сарочак
Прыкрывае стагодні бруд.

Дзе ім ведаць, як вішні у цвеце
Шалясцяць пад дажджом зарніц.
Як вячэрнія зоркі свецяць
У бяздоннай імгле крыніц.

Дзе ім ведаць пра дружбу ў паходзе,
Калі, стомлены доўгім днём,
Рад сябрам памагчы ў нягодзе,
Падзяліцца апошнім рублём.

Вось ён, свет блакітна-зялёны:
Скарбаў безліч — бяры, не хачу!
За чабор, за расу на клёнах
Я любоўю вялікай плачу.

Я хацеў-бы раз'юшаным лівнем
Змыць і сплавіць старую цвіль,
Каб у самай глухой даліне
Пышна сад плоданосны расцвіў.

Каб не кратала ўласнасці плесня
Чалавечых прыгожых душ,
Каб паэты складалі песні
Не з нянавісці — з сонца і руж.

Беласток, 1940.

Малады кампазітар

Мечэславу Вайнбергу 20 год. У клас прафесара Залатарова ён прыйшоў у мінулым годзе, пасля некалькіх год заняткаў у Варшаўскай кансерваторыі. Музыкальная атмасфера, у якой выхоўваўся малады музыкант, была насычана рэакцыйнымі тэндэнцыямі сучаснай заходнееўрапейскай музычнай культуры, якая характарызуецца згубай духоўнага чалавечага пачатку: абстрактнасцю музыкальнай мовы, канструктывізмам і фармалістычнымі трукацтвамі, наўмыснай гарманічнай утончанасцю, якая прыводзіць да ладавай неакрэсленасці — атанальізма. Атмасфера сапраўды не магла не зрабіць уплыву на нявопытнага музыканта, якім і з'яўляўся Вайнберг, вось чаму ў яго творчасці, творчасці маладога кампазітара, ёсць рэзка выражанае «учора» і «сёння».

«Учора», гэта творчасць Вайнберга да прыходу ў Дзяржаўную кансерваторыю БССР, — яго мазуркі, калыханка, 1-шы струнны квартэт, некалькі частак няскончанай балетнай сюіты. «Сёння» — гэта творчасць апошняга года, гэта 2-гі струнны квартэт, эскізы 1-й часткі сімфоніі, рамансы.

Мазуркі (1933) і калыханка (1935) — п'есы для фортэп'яна. Па стылю яны, бадай, нічым не адрозніваюцца ад раду іншых п'ес сучасных заходнееўрапейскіх кампазітараў: тая-ж гарманічная жорсткасць, багацце храматызмаў, неапраўдана надуманыя адхіленні, зыбкая мелодыя. Вялікай вартасцю твораў з'яўляецца іх піяністычнасць — вынік добрага валодання фортэп'яна самім кампазітарам.

1-шы струнны квартэт до-мінор напісан з добрым веданнем квартэтнай фактуры. Самая цікавая — 1-я частка квартэта. 1-я тэма, хоць і ўступае на слабым часе, вельмі актыўная, чоткая і ясная, але не завяршаецца, а растварaецца ў музыкальнай тканіне; 2-я тэма мала кантрастная, не яркая. У цэлым квартэт напісан пад моцным уплывам імпрэсіяністаў і, па словах самога аўтара, пад уплывам Шыманоўскага.

Часткі балетнай аркестровай сюіты цікавы тым, што ў іх ёсць мелодыя, і яна праваліруе, — гэта стылізацыя пад яўрэйскую народную песню, і гэта наяўнасць мелодыі як-бы затушоўвае гарманічную «жорсткасць».

Было-б, вядома, дзіўным сказаць, што творчасць «сёнешняга дня» у Вайнберга наступіла раптам, па ўзмаху цудоўнай палачкі. Сутнасць метамарфозы заключаецца ў вялікім уплыве перайманія. Вайнбергу не чужда мелодыя, не чужда выразнасць, але ён хаваў яе, наследуючы і пераймаючы законадаўцаў свайго музычнага асяроддзя. І гэта стрыманасць у праяўленні сваіх пачуццяў зляцела, як луска, як толькі ён пераканаўся ў яе непатрэбнасці.

2-гі струнны квартэт (соль-мажор) з'явіўся першай работай Вайнберга ў класе прафесара Залатарова. Квартэт напісан у падражанне класічнай сімфоніі Пракоф'ева. Тут Вайнберг прытрымліваецца ўсіх дэталей класічнай формы, аж да традыцыйнага паўтарэння экспазіцыі. Абедзве тэмы санатнага алегро строга акрэслены. 1-я частка падкупае сваёй лёгкасцю і грацыёзнасцю і сведчыць аб добрым гусце. 2-я частка — андантэ — валодае незвычайнай пранікнёнасцю, цеплынёй, сапраўднай цудоўнай лірыкай і разам з тым нейкай бахаўскай сузіральнасцю (праўда, падвержанай некаторай «мадэрнізацыі»). Гэта частка цікава і з пункту гледжання формы. У сярэдняй частцы праходзіць скерца: лятучае, фантастычнае, са своеасаблівай рытмікай, — нейкія няўлоўныя вобразы (шкада толькі, што часам вельмі моцна адчуваецца мелодычны рысунак Шастаковіча). У рэпрызе адбываецца як-бы злучэнне абедзвюх тэм: тэма андантэ праходзіць на фоне скерцо (пасля моцнага нарастання застаецца на піянісіма толькі тэма андантэ). 3-я частка — менуэт; з пункту гледжання меладычнай мовы, гэта як-бы зварот да ранейшых тэндэнцый — пераймaнне сучаснай заходнееўрапейскай музыкі. Фінал (4-я частка) напісан з вялікім тэмпераментам і вельмі эфектны.

Выдатным узорам паказу «перабудовы» у творчасці Вайнберга з'яўляюцца яго эскізы 1-й часткі сімфоніі, якую ён назваў «рамантычнай». Тут, нягледзячы на адсутнасць праграмнасці, музыка вылучаецца вялікай канкрэтнасцю, меладычнай выразнасцю, эмацыянальнай насычанасцю, тут упершыню раскрываецца «душа» кампазітара.

Апошнія творы Вайнберга — рамансы на тэксты польскіх паэтаў — прымушаюць баяцца, ці не падпаў аўтар пад уплыў фармалізма, бо ў гэтых рамансах, перш за ўсё, адсутнічае песеннасць, іх музыкальная мова адцягненая, адчуваецца некаторая надуманасць. З гарманічнага боку яны некалькі «жорсткаваты».

У заключэнне хочацца адзначыць, што творчасць маладога кампазітара, студэнта Дзяржаўнай кансерваторыі БССР Вайнберга, вельмі своеасаблівая і безумоўна цікавая, але яму трэба ўхіляцца ад шкодных фармалістычных уплываў, а таксама звярнуць належную ўвагу на народную музыку, у якой ён можа неабмежавана чэрпаць мелас.

С. НІСНЕВІЧ.

КОМСАМОЛЬЦЫ-МАСТАКІ

Аб чым спрачаліся звычайна вучні, калі набліжаліся залікі, а з імі і апошнія дні прабывання ў тэхнікуме? Аб праграмах, навучальных планах, аб метадах выкладання. Папракалі ў тым-сім дырэкцыю. Але ў адным сыходзіліся ўсе. Аб гэтым «адным» з цёплым пачуццём прыгадвае былы комсамолец і студэнт Віцебскага мастацкага тэхнікума (цяпер вучылішча) Еўгеній Зайцаў:

— Тэхнікум прывучаў моладзь да самастойнай работы, да ўпартай працы, тэхнікум быў месцам згуртавання людзей, страсна любіўшых жывапіс, скульптуру, графіку.

Сын селяніна Уздзенскага раёна Сцяпан Андруховіч, сын мінскага чыгуначніка Генрых Бржазоўскі, сын чорнарабочага з Койданава Абрашa Кроль — усе гэтыя комсамольцы выйшлі з сцен тэхнікума з «пуцёўкай» на права творча працаваць, ствараць творы, якія ў мастацкіх вобразах услаўляюць поўнакроўнае, шчаслівае жыццё нашай любімай радзімы.

Якіх-небудзь восем год аддзяляюць мастака-комсамольца Сяргея Каткова ад школьнай лавы. А ўжо сярод гуртакоўцаў мінскага Палаца піонераў ён заслужыў вялікую папулярнасць. Ізогурток пад кіраваннем гэтага ўдумлівага і скромнага педагога вырасціў цэлую плеяду таленавітых юных мастакоў. Яго работы ацэньвала нядаўна грамадскасць Мінска на ізовыстаўцы к усебеларускай алімпіядзе дзіцячай творчасці. Каткоў — добры пейзажыст. За ўмелую работу з піонерамі, за ўзорную пастаноўку ізогуртка тав. Каткоў узнагароджан Граматай Вярхоўнага Совета БССР.

Вядзе педагагічную работу ў Віцебску комсамолец Хонан Гутэрман. Сын беднага саматужніка аднаго з беларускіх мястэчак, ён дзякуючы совецкай уладзе і атрыманаму ў комсамоле выхаванню паспяхова закончыў мастацкую акадэмію ў Ленінградзе, вырас у сур'ёзнага выкладчыка жывапісу, быў удзельнікам раду выставак у Сімферопалі, Маскве. Тав. Гутэрман рыхтуе ў Віцебскім мастацкім вучылішчы маладыя творчыя кадры для расквітнення беларускага выяўленчага мастацтва.

Афарміцельнай справе прысвяціў сябе мастак-комсамолец Абрам Кроль. У беларускім павільёне на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы лепшыя стэнды аформлены Кролем. Тав. Кроль рыхтуе першую кампазіцыйную работу на тэму «Забастоўка грузчыкаў на ст. Мінск у часе белапольскай акупацыі» для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці», прысвечанай 23-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Творчую працу з вялікай грамадскай работай спалучае комсорг Саюза мастакоў Сцяпан Андруховіч. На выстаўцы к дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве ён быў прадстаўлен карцінай «Арышт большэвіцкіх агітатараў белапалякамі». Мастацкая грамадскасць Масквы цёпла прыняла работу маладога аўтара, многія знаходзілі, што па манеры пісьма і кампазіцыйнаму вырашэнню сюжэта гэты твор блізкі да рэпінскіх работ. Тав. Андруховіч дасканала засвоіў указанні вялікіх правадыроў аб авалоданні моладдзю культурнай спадчынай мінулага.

«Вясна», «Асенні сад», «На лузе» — такі далёка не поўны пералік эцюдаў комсамольца Г. Бржэзоўскага. Ён любіць беларускую прыроду, жывапісныя куточкі сваёй радзімы і з вялікім пачуццём паказвае іх на палатне. На ўскраінах Мінска Бржэзоўскага год дванаццаць назад ведалі як азарніка. Комсамол падняў яго, даў магчымасць скончыць Віцебскае мастацкае вучылішча. Бржэзоўскі — удзельнік усіх выставак. Нядаўна ён скончыў для адкрываючайся 7 лістапада выстаўкі карціну на тэму «Разгром белапольскага атрада сялянамі». У ёй шмат жыцця, карціна добрая па каларыту, удалая ў кампазіцыйных адносінах.

Давід Генін — таксама выхаванец Віцебскага мастацкага вучылішча. За актыўную падрыхтоўку да дэкады беларускага мастацтва і заслугі на ізофронце тав. Генін Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР узнагароджан Ганаровай граматай. Цяпер ён адзін з актыўных удзельнікаў выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Сярод маладых мастакоў-комсамольцаў нямала людзей, паспяхова закончыўшых Усерасійскую акадэмію. Сярод іх — Ізергіна, аўтар вялікага твора «Юныя дараванні», працуе ў Мінску; Хонан Гутэрман, які працуе педагогам у Віцебску; Залман Зальцман, былы рабочы абутковай фабрыкі, цяпер аспірант Акадэміі; Барыс Каплан, які ў будучым годзе заканчвае акадэмію, сталінскі стыпендыят. Выпускнік Акадэміі Е. Зайцаў прадставіў на выстаўку, прысвечаную дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве, карціну «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск», якая сведчыць аб вялікім творчым дыяпазоне аўтара, аб несумненнай яго культуры. На выстаўцы, прысвечанай 20-годдзю ВЛКСМ, у 1939 годзе Зайцаў атрымаў другую прэмію. А за выдатныя заслугі ў развіцці беларускага мастацтва Зайцаў у чэрвені 1940 года атрымаў вышэйшую ўзнагароду — ордэн «Знак почета». Але тав. Зайцаў не толькі творчы работнік, ён перадае свой вопыт і веды моладзі, з'яўляючыся выкладчыкам жывапісу на курсах павышэння кваліфікацыі маладых мастакоў. З 1939 года тав. Зайцаў — член КП(б)Б.

Усё гэта — мастакі, якіх выхаваў і выхоўвае ленінска-сталінскі комсамол.

І. РУБІНШТЭЙН.



Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета БССР паказаў прэм'еру балета Чайкоўскага «Лебядзінае возера» у новай пастаноўцы балетмейстра К. А. Мулера.
На здымку: Народная артыстка БССР **З. А. Васільева** ў партыі Одэтты.
Фота І. Каплінскага.

ВЫДАТНЫЯ ПОСПЕХІ

Мастацтва песні і слова пастаўлены ў Чырвонай Арміі на службу мастацтву перамагаць. З кожным годам павышаецца ўсебаковая культура асабовага складу Чырвонай Арміі, мацнее баявая магутнасць яе, а побач з гэтым расце самадзейнае мастацтва байцоў і камандзіраў, якое з'яўляецца магутным сродкам палітыка-выхаваўчай работы.

Два дні, 11 і 12 кастрычніка, у Мінску праходзіў VIII акруговы агляд чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці. Лепшыя калектывы, групы і салісты дэманстрыравалі ўзоры свайго рэпертуару, спаборнічаючы на першынство.

Харавая культура ў Чырвонай Арміі дасягнула значных поспехаў. Кантата аб Сталіну, гімн партыі большэвікоў, песня аб слаўным сыну народа, любімым наркому Цімашэнку, прагучалі некалькі разоў. Малодшы камандзір, кампазітар-самавучка тав. Сасулін напісаў песню аб Цімашэнку. Былі выкананы класічныя хоры, народныя песні.

Па-ранейшаму высокую культуру дэманструе харавы калектыў пад кіраваннем чырвонаармейца тав. Целяшэўскага. Кантата аб Сталіну, гімн партыі большэвікоў, песня аб Цімашэнку выкананы ў змешаным ансамблі; хор падарожнікаў з оперы «Дэман», хор паляўнічых з оперы «Чароўны стралок» і «Волжская-бурлацкая» — у мужчынскім хоры ў добрай культуры выканання; у выразнай інтанацыі ім-жа паказан жаночы хор у праграме украінскай народнай песні.

Вырас і паказаў сваю сілу ўпершыню выступіўшы на акруговым аглядзе чырвонаармейскі хор інтэнданта 3 ранга тав. Алферава з праграмай чырвонаармейскіх баявых песень.

Свежае ўражанне зрабіў таксама ўпершыню выступаўшы на аглядзе змешаны казачы хор пад кіраваннем чырвонаармейца тав. Рышчанка. Былі добра выкананы «Песня аб Цімашэнку» Покраса і народная украінская песня «Сусідка». Малады калектыў упарта працаваў над рэпертуарам і дабіўся адчувальных вынікаў.

Вялікае ўражанне на аглядзе зрабіў сімфанічны аркестр пад кіраваннем чырвонаармейца тав. Гардзіенкі. За вынікам яго бліскучых дасягненняў крыецца ўпартая работа невялікага калектыва чырвонаармейцаў-музыкантаў, якія спалучаюць баявую падрыхтоўку са скрыпкай і флейтай, якія аддаюць сваю творчую актыўнасць справе палітычнага выхавання байца. Рэпертуар гэтага ансамбля разнастайны і цікавы: «Тры танцы народаў СССР» Шапашнікава, уверцюра к оперы «Руслан і Людміла» Глінкі, «Урачысты марш» Мендэльсона, «Венгерскі танец № 6» Брамса і г. д.

Да ліку паказальных выступленняў на аглядзе трэба аднесці секстэт домр пад кіраваннем І. А. Рыбкіна, які прадэманстрыраваў сваю выдатную музычную тэхніку выкананнем твораў Бетховена «Турэцкі марш» і «Нямецкі танец»; ансамбль бандурыстаў пад кіраваннем чырвонаармейца тав. Федарэнкі, які выдатна і выразна выканаў жартаўлівыя украінскія песні; квартэт акардэаністаў, у якім чырвонаармейцы т.т. Канеўскі, Целяшэўскі, Байкоў і Покутнеў паказалі выдатную тэхніку сыгранасці.

З ліку джазавых калектываў найбольш выразна, ва ўдалай інструментоўцы і ансамблевай сыгранасці прагучаў джаз-аркестр пад кіраваннем старшага лейтэнанта тав. Прамыслова. Гэтаму садзейнічала галасавая разнастайнасць калектыва і ўменне кіраўніка аркестраваць п'есы ў стрыманай і мяккай манеры. Джаз-аркестры тэхніка-інтэнданта 2 ранга тав. Жураўскага і чырвонаармейца тав. Чарнамерца таксама з'яўляюцца добра музычна зладжанымі калектывамі, але налёт таннай «тэатральшчыны» у апошняга псаваў якасць музыкальнага выканання.

Вялікую ўдзельную вагу ў пераважнай колькасці чырвонаармейскіх плясак меў на аглядзе танцавальна-плясавы жанр. Былі прадстаўлены: «Лявоніха» у пастаноўцы жонкі камандзіра тав. Бальнанавай, «Гапак», «Малдаванеску» у пастаноўцы жонкі чырвонаармейца тав. Лашманавай, плясавыя калектывы пад кіраваннем чырвонаармейцаў тт. Багданава, Ваяводзіна, Мазіна, Якушына і інш. Паміж імі на аглядзе з вялікім уздымам ішло спаборніцтва і барацьба на арыгінальнасць, эксцэнтрычнасць, выдумку рысунка. Цяжка вырашыць, хто з іх лепшы. Усе калектывы заслужылі высокую пахвалу.

Выступіўшы на аглядзе ўдзельнік трох папярэдніх аглядаў—балалаечны аркестр пад кіраваннем малодшага камандзіра тав. Сасуліна паказаў разгорнутую праграму. Вялікае ўражанне зрабіла песня аб Цімашэнку (аўтар музыкі—кіраўнік аркестра тав. Сасулін), па-майстэрску была выканана «Восеньская песня» Чайкоўскага, дзе ў сольнай партыі на баяне паказаў высокія мастацкія якасці чырвонаармеец тав. Владзіміраў. З незвычайнай жывасцю прагучалі чырвонаармейскія частушкі.

У добрай культуры і з разнастайным рэпертуарам прайшлі на аглядзе майстры мастацкага чытання. Сярод іх вылучаюцца чырвонаармеец тав. Швейкоўскі (паэма Джамбула «Узброены народ»), ст. палітрук тав. Жалтоў (верш В. Гусева «Два парады»), малодшы камандзір тав. Елісееў («Гусар» Пушкіна).

Музычныя салісты былі прадстаўлены ў вялікай разнастайнасці. Вялікае ўражанне зрабілі піяніст-чырвонаармеец тав. Іоффе, які бліскуча выканаў «Фугу» Баха Галоўскага, і тэмпераментны піяніст-курсант тав. Дранаў, які сыграў парафразу Вердзі-Ліста «Рыгалета». Добра выканалі на фортэп'яна чырвонаармейцы тав. Канеўскі—вальс № 7 Шапэна і тав. Башлыкоў—адвольныя імправізацыі. Сярод скрыпачоў вылучаўся чырвонаармеец тав. Ансалямаў, які выканаў «Рандо-Капрычыёза» Сен-Санса. Лепшым балалаечнікам на аглядзе быў чырвонаармеец тав. Чуб («Уральская плясавая» Траяноўскага) і лепшым баяністам — чырвонаармеец тав. Мурзілін («Цудоўны Размарын» Крэйслера). Чырвонаармеец тав. Катсон паказаў добрую тэхніку ігры на віяланчэлі («Мелодыя» Рубінштэйна). Дасканалую ігру на гітары ў вялікай лірычнай глыбіні і хвалюючай шчырасці выканання прадэманстрыраваў чырвонаармеец тав. Мансураў.

Спевакі і спявачкі паказалі разгорнутую праграму твораў совецкіх кампазітараў і класікі. Сярод іх—старыя ўдзельнікі самадзейнасці акругі: ветурач тав. Пічугін, жонка камандзіра тав. Фошчанка і моладзь, выступаўшая ўпершыню: жонка камандзіра тав. Шэндрыкава, ваентэхнік 1 ранга тав. Гельман, малодшы лейтэнант тав. Абрамаў і іншыя. Іх выступленні сведчаць аб сур'ёзных адносінах да мастацтва, аб вялікай рабоце над голасам.

Майстэрства мастацкай акрабатыкі і гімнастыкі было прадстаўлена на аглядзе асабліва поўна і разнастайна.

Тры акрабатных калектывы выгодна вылучаліся сваёй мастацкай апрацоўкай і выдатнай спрацаванасцю: акрабатычны калектыў чырвонаармейца тав. Трыпуціна, які здзівіў гледача паскораным тэмпам і акрабатычнай віртуознасцю, партэрная група лейтэнанта тав. Харэшына, якая дабілася чоткай работы і дасягненняў у балансе і моцнай эмацыянальнасці, і група выкладчыка тав. Міхайлава, якая паказала бліскучую кампазіцыю мастацкіх груп.

Актывісты самадзейнасці—лепшыя байцы, носьбіты прыкладнай дысцыпліны. Песня і слова былі і застаюцца натхніцелямі баявога парыву байца і ў гэтым іх велізарная заслуга. Ідучы ў масу праз самадзейнасць, яны ўмацоўваюць грозную зброю Чырвонай Арміі, робяць яе больш сакрушальнай для ворагаў.

Тысячы музыкантаў, спевакоў, майстроў чытання, зацейнікаў — велізарная сіла, якая выхоўвае ў чырвонаармейскіх масах палітычную свядомасць і культурнасць.

Влад. МУРАТ.

М. Лынькоў

АБ ТЫПЕ СОВЕЦКАГА ПІСЬМЕННІКА І ЯГО МАРАЛЬНЫМ АБЛІЧЧЫ

На першым Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў адным з выступаючых была выказана такая думка:

— Партыя і ўрад далі пісьменніку ўсё, адабраўшы ад яго толькі адно — права пісаць кепска.

Простая і ясная ісціна. Аднак, трэба прызнацца, што некаторыя з нас, пісьменнікаў, забываюцца на гэту ісціну. За шэсць год, прайшоўшых з часу з'езда, паяўляліся і такія кнігі, якія нічога не ўнеслі ў літаратуру, якія не вызначыліся ні арыгінальнай ідэяй, ні арыгінальнай формай, нічым не ўзрадавалі чытача. Паяўляліся часам і такія творы, якія былі чужы нашай рэчаіснасці, бо яны скажалі яе, бо яны неслі нам чужыя, буржуазныя ідэі, чужыя ўплывы, чужую мараль.

У чым прычына такіх выпадкаў? У чым прычына таго, што ў вялікую совецкую літаратуру, самую перадавую літаратуру ў свеце, літаратуру, на якой вучацца, перавыхоўваюцца мільёны працоўных нашай радзімы, літаратуру, якая па-праву з'яўляецца «узбудзіцелем усіх лепшых рэвалюцыйных сіл свету», чаму ў гэту літаратуру пранікаюць часам творы, недастойныя яе, недастойныя нашага совецкага народа, нашай вялікай справы?

Каб даць адказ на гэта пытанне, я прывяду словы нашага вялікага пісьменніка і настаўніка, Аляксея Максімавіча Горкага. Ён гаварыў на з'ездзе пісьменнікаў:

— «У чым бачу я перамогу большэвізма на з'ездзе пісьменнікаў? У тым, што тыя з іх, якія лічыліся беспартыйнымі, «хістаючыміся», прызналі — са шчырасцю, у паўнаце якой я не смею сумнявацца, — прызналі большэвізм адзінай, баявой, кіруючай ідэяй у творчасці, у жывапісу словам. Я высока цаню гэту перамогу, бо я, літаратар, па сабе ведаю, як свавольны думка і пачуццё літаратара, які спрабуе знайсці свабоду творчасці па-за строгімі ўказаннямі гісторыі, па-за яе асноўнай і арганізуючай ідэяй. Адхіленні ад матэматычна прамой лініі, выпрацаванай крывавай гісторыяй працоўнага чалавецтва і ярка асветленай вучэннем, якое ўстанаўлівае, што свет можа быць зменен толькі пралетарыятам і толькі пры дапамозе рэвалюцыйнага ўдару, а затым пры дапамозе соцыялістычна арганізаванай працы рабочых і сялян, — адхіленні ад матэматычнай прамой растлумачваюцца тым, што нашы эмоцыі — старэй нашага інтэлекту, тым, што ў нашых эмоцыях многа ўзятага ад спадчыны, і гэта спадчына варожа супярэчыць указанням розуму.

...Мы, літаратары, работнікі мастацтва найбольш індывідуальнага, памыляемся, лічачы наш вопыт аднаасобнай уласнасцю, тады як ён — уушанне рэчаіснасці і — у мінулым — вельмі цяжкі дар яе. У мінулым, таварышы, бо ўсе мы ўжо бачылі і бачым, што новая рэчаіснасць, ствараемая партыяй большэвікоў, увасабляючая розум і волю мас, — новая рэчаіснасць прапануе нам дар пулоўны — небывалы дар інтэлектуальнага цвіцення многіх мільёнаў рабочага люду».

Як управе быў Аляксей Максімавіч, калі гаварыў аб нашых эмоцыях, якія «старэй нашага інтэлекту». Наша літаратура — верная зброя партыі ў комуністычным выхаванні працоўных, у ліквідацыі ўсіх капіталістычных перажыткаў у свядомасці людзей. І каб добра справіцца з гэтай вялікай і пачэснай задачай, тыя, хто ствараюць літаратуру, нашы літаратары, пісьменнікі самі павінны быць пазбаўлены ўсякіх капіталістычных перажыткаў у сваёй свядомасці. Інакш быць не можа.

«Наш совецкі пісьменнік,—гаварыў А. М. Горкі,—не можа быць толькі прафесіянальным літаратарам, гэта—жывая асоба, жывы, энергічны ўдзельнік усяго таго, што творыцца ў краіне».

Таварыш Сталін назваў пісьменнікаў інжынерамі чалавечых душ. Гэта вялікае і ганаровае званне. Каб поўнасцю яго апраўдаць, кожны пісьменнік павінен, перш за ўсё, быць перадавым чалавекам сваёй эпохі, пасьбітам перадавых ідэй чалавецтва. Гэта значыць, ён павінен быць высокакультурным, усебакова развітым чалавекам, якога павінны цікавіць любое пытанне, любая з'ява, любая галіна навукі і мастацтва. Ён павінен быць дасканала ўзброен рэвалюцыйным вучэннем марксізма-ленінізма, каб беспамылкова разбірацца у складаных формах і працэсах нашага жыцця, нашай дзейнасці, у сучаснасці і мінулым свайго народа, сваёй краіны. Але і гэтага яшчэ мала. Пісьменнік павінен і сваімі асабістымі паводзінамі, сваім асабістым удзелам у творчым жыцці народа быць яркім прыкладам чалавека-грамадзяніна, чалавека-барацьбіта за комунізм, чалавека-творца нашага грамадства.

Грош цана таму пісьменніку, які ў сваёй канкрэтнай дзейнасці, у жыцці, у быту сваім, у паводзінах губляе тыя благародныя ісціны, якія прапаведуе ён у сваіх творах. Тут мы падыходзім да пытання аб маральным абліччы совецкага пісьменніка. Найлепшым прыкладам у гэтым пытанні для ўсіх нас з'яўляецца аўтар неўміручай кнігі «Як гартавалася сталь» — Н. Астроўскі.

«... Кожны з нас павінен вучыць не толькі сваім словам, але і ўсім сваім жыццём, паводзінамі»,—гэтыя словы, сказаныя Астроўскім незадоўга да сваёй заўчаснай смерці, кожны совецкі пісьменнік павінен пакласці ў аснову сваёй творчай і грамадскай дзейнасці. Пісьменнік Астроўскі ніколі не разыходзіўся з совецкім грамадзянінам Астроўскім, з большэвіком Астроўскім. На яго агромністай маральнай сіле, асабістых якасцях, асабістым прыкладзе вучыліся і вучацца мільёны нашай моладзі. Вучацца палымнеючай пянавісці да ворагаў, страснай любві да свайго класа, да працоўных, да прыгнечанага чалавецтва. Вучацца вялікаму пачуццю пролетарскай салідарнасці, высокаму соцыялістычнаму гуманізму. Вучацца мужнасці, упартасці ў пераманні цяжкасцей, вучацца выхоўваць у сабе стальную волю да перамогі, нязгасную веру ў перамогу комунізма. Вучацца радаснаму, жыццесцвярджаючаму аптымізму пісьменніка-байца. Вучацца бязмежнай адданасці сваёй радзіме, патрэбнай часам самаахвярнасці, здольнасці к самаабмежаванню, к адмаўленню ад тых ці іншых магчымасцей у імя барацьбы за далейшыя перамогі комунізма.

Мы ведаем, як арганічна, шчыльна звязан быў Астроўскі з рэчаіснасцю, з жыццём. Мы ведаем, як многа клапаціўся Астроўскі аб сваім культурным узроўні, аб авалоданні бязмежнай спадчынай культуры, і ў той-жа час так многа думаў і рабіў, каб яго мастацкае слова было даступна масам, было зразумела для іх.

Астроўскі не з'яўляецца такім ужо рэдкім выключэннем у совецкай літаратуры. У слаўнай сям'і совецкіх пісьменнікаў мы змаглі-б назваць многія імёны, па творчай дзейнасці і жыццю якіх мы можам многаму і многаму вучыцца.

Зараз у нашых літаратурных арганізацыях ідзе вялікая перабудова. Рашуча адмятаецца ў іх жыцці ўсё, што не мае непасрэднага дачынення да творчай працы. Памятаючы, што «нашы эмоцыі— старэй нашага інтэлекту», мы прымаем усе захады да наладжвання сталай, сістэматычнай ідэйна-выхаваўчай працы. Толькі гэта праца забяспечыць пісьменнікаў ад ідэйна-творчых зрываў і памылак, дапаможа кожнаму нашаму пісьменніку па-большэвіцку асэнсаваць жыццё і ўсю нашу рэчаіснасць, стаць бліжэй да жыцця, узброіцца вялікім вучэннем марксізма-ленінізма, без якога нямысліма сапраўдная творчасць, сапраўднае мастацтва краіны соцыялізма.

Зм. Бядуля

МАЕ ЗАЎВАГІ

Работа над сабой у галіне марксізма-ленінізма, работа над мастацкім словам, веданне і разуменне нашага жыцця, сувязь з жыццём, з нашай штодзённай героікай, высокая маральнасць, любоў да шматнацыянальнага совецкага народа, — вось што трэба совецкаму пісьменніку, каб пісаць добрыя творы, вартыя нашага часу.

Нельга сказаць, каб нашы пісьменнікі не працавалі стала над сабою. Кожны з нас працуе, але, відаць, мала і не сістэматычна. У некаторых з нас часта нехапае сур'ёзнага разумення значэння мастацкай літаратуры для народа. Таму мы не адносімся з усёй увагай да сваёй творчасці і да творчасці таварышоў.

Нас часта «заядалі» гаспадарчыя дробязі, якімі павінны былі займацца не мы самі, і гэта нам таксама нямала перашкаджала ў працы. Творчымі пытаннямі мы займаліся не сістэматычна, калі-ні-калі. Апрача таго, часам нашай працы перашкаджалі дробныя сваркі, інтрыжкі, нават дробныя помсты.

Праўда, не павінна быць у нас евангельскага міру, ангельскага благадзенства між сабою, але калі бываюць у нас спрэчкі, то яны павінны быць прынцыповага творчага парадку, а ў нас не заўсёды так бывала.

Пісьменніцкі быт павінен быць чыстым, высокакультурным, высокамаральным, тады нашы творы будуць куды лепшымі, чым цяпер.

Калі старэйшыя пакаленні пісьменнікаў адносяцца ў нас даволі сур'ёзна да культуры слова, да стылю, то некаторыя з маладых, шчыра кажучы, адцяпаюць кніжку і адразу нясуць яе ў выдавецтва. Няхай-бы яны параіліся з старэйшымі таварышамі, паказалі-б ім свой твор. Не, нясуць адразу ў выдавецтва. А вось паказалі мне нядаўна ў выдавецтве зборнік апавяданняў тав. Левановіча. Я не раз дапамагаў Левановічу ў яго творчасці, але прыходзіцца сказаць, што мне паказалі такія няграматныя радкі—з боку стылю, з боку граматыкі, з боку логікі, вобразаў, што мне аж но сорамна стала. Мы не выхоўваем любоў да мастацкага слова, да звычайнай школьнай граматнасці ў маладых людзей. Гэта наша неахайнасць. Мы не ўмеем выхоўваць маладых людзей.

Цяпер адносна незвычайнай няграматнасці. Ёсць у нас крытыкі, бадай што акадэмікі. На вялікі жаль, яны могуць павучыцца граматнасці ў таго-ж тав. Левановіча, аб якім я толькі-што гаварыў. Проста жах, проста дзіўна, як пішуць іншыя крытыкі. Я не паверыў-бы, калі-б работнікі выдавецтва не паказалі мне матэрыял. Работнікі выдавецтва любяць беларускую совецкую літаратуру, ім прыходзіцца работаць па артыкулах крытыкаў, бадай што акадэмікаў. Яны правяць гэтыя артыкулы некалькі разоў, бегаюць у бібліятэкі, каб сабраць матэрыял аб тым ці іншым пісьменніку, пра якога крытыкам напісан артыкул. Няхай гэтыя крытыкі не лянуюцца працаваць над сабой. А між іншым гэткі «крытык» прыходзіць і пачынае вучыць нашага брата-пісьменніка. Як мы можам верыць яго навучанню, калі ён няграматны чалавек? Гэта нікуды не варта. Як такія крытыкі могуць нашы творы разбіраць, калі ім самім трэба сямігодку праходзіць!

І яшчэ аб некаторых недахопах. Неяк мне трапіў у рукі яўрэйскі журнал «Штэрн». Я знайшоў там цыкл вершаў паэтэсы Баўмволь. Мы ведаем тав. Баўмволь, як паэтэсу здольную, але-ж гэты цыкл вершаў мяне проста здзівіў, бо такія вершы маглі быць напісаны 1.000 альбо нават 1500 год назад. У чым справа? Я знаходжу ў Баўмволь на стале зборнік старажытна-персідскай паэзіі, старажытна-арабскай паэзіі. Вядома, вучыцца ў паэтаў вялікай даўнасці не дрэнна. Нам трэба вучыцца ва ўсіх вялікіх майстроў, але-ж капіраваць тое, што было тысячу год назад, недарэчна. Тэма кахання безумоўна важная тэма, патрэбная нам тэма, але-ж трэба неяк увязваць пачуццё кахання з нашым часам, з нашымі абставінамі.

Мы не навучыліся яшчэ адносіцца да працоўнага чалавека з той любоўю, з той далікатнасцю, як умеў гэта рабіць вялікі пісьменнік Максім Горкі. Ёсць у нас у гэтым кірунку вельмі нядобрае з'явішча. Няхай мне прабачыць тав. Ільінскі, але ўсё-такі ў некаторых яго творах ён лёгкадумна адносіцца да людзей. Возьмем хаця-б яго аднаактоўку «Месія». У ёй Ільінскі паказвае персанажы ў такой афарбоўцы, што сорамна робіцца за гэтых прыніжаных людзей з яўрэйскага народа. Ці мала ёсць сярод яўрэйскага народа герояў, якія змагаліся за рэвалюцыю, за совецкую ўладу? Няўжо-ж трэба было выбраць для сваёй аднаактоўкі абавязкова такую дзяўчыну, якую хацелі згвалтаваць? Навошта паказваць такіх прыніжаных людзей і ў такіх прыкрых сітуацыях, ад якіх становіцца прыкра?

Рэдактары нашых журналаў часам няўважліва адносяцца да сваіх абавязкаў. Возьмем хаця-б такі факт: у адным з літаратурных нумароў дзіцячага журнала «Іскры Ільіча» змешчана, як беларускі кантэсны фальклор, казка пра трусіка і ваўка. Што-ж гэта за казка? Я думаю, многія з нас ведаюць «Казкі дзядзюшкі Рымуса» англійскага пісьменніка Харыса. Слова ў слова на беларускую мову перапісана гэта казка і пададзена як беларускі фальклор. Гэта ганьба. Усе вучні, усе малыя чытачы, якія чытаюць «Іскры Ільіча», будуць смяяцца. Нельга-ж так рабіць. Трэба адносіцца да абавязкаў рэдактара больш старанна.

Павышэнне ідэйна-палітычнага ўзроўню пісьменніка, настойная барацьба за якасць нашых кніг—вось што з'яўляецца першым і неабходнейшай умовай далейшага росту нашай літаратуры, разумнай, усхваляванай, праўдзівай і страснай літаратуры соцыялізма.

СХОД ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАСТОКА

5 кастрычніка адбыўся сход пісьменнікаў Беластока, прысвечаны ідэйнаму выхаванню совецкага пісьменніка.

У сваім дакладзе старшыня бюро беластоцкага аддзялення ССП БССР дэпутат Вярхоўнага Совета СССР Ф. С. Пестрак на прыкладзе мінулага і сучаснага беларускай і рускай літаратуры паказаў неразрыўную сувязь пісьменніка са сваім народам. Лепшыя пісьменнікі былі заўсёды на ўзроўні свайго часу, з'яўляліся прапагандыстамі перадавых ідэй. Дакладчык звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць глыбокай палітыка-выхаваўчай работы сярод пісьменнікаў.

Бюро аддзялення ССП БССР, з дапамогай партыйнай арганізацыі горада арганізоўвае семінар і кансультацыі для пісьменнікаў, вывучаючых «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Напярэдадні кастрычніцкіх святаў у клубе пісьменнікаў лектарамі абкома і гаркома партыі будуць прачытаны лекцыі аб гісторыі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, аб Чырвонай Арміі, аб поспехах соцыялістычнага будаўніцтва Беластоцкай вобласці, аб міжнародным становішчы.

Разгарнуўшыяся пасля даклада спрэчкі наглядна паказалі, наколькі неабходна ў асяроддзі беластоцкіх літаратараў сур'ёзная паўсядзённая ідэйна-выхаваўчая работа. Многія выступаўшыя ў спрэчках яўна не разумелі сутнасці патрабаванняў да совецкага пісьменніка—інжынера чалавечых душ. Большасць выступаўшых абмяжоўваліся агульнымі разважаннямі аб крытычным і соцыялістычным рэалізме, рамантызме і іншых «ізмах», абмінаючы факты лёгкадумнага падыходу асобных беластоцкіх польскіх і яўрэйскіх пісьменнікаў да совецкай тэматыкі, прыклады спекуляцыі актуальнасцю тэмы, прыклады заскарузлага буржуазнага эстэтызма, уплываў рэлігійнага дурману, бытавой неахайнасці, — усяго, што яшчэ знаходзіць сабе месца ў асяроддзі беластоцкіх пісьменнікаў, атручвае іх творчую атмасферу.

В. ЦІМСКІ.

Беласток (наш кар.).

К. Крапіва

ВЯЛІКАЯ АДКАЗНАСЦЬ

Мне заўсёды робіцца страшнавата, калі я думаю аб тым, што ўсе мы, совецкія пісьменнікі, у тым ліку і беларускія, нясём адказнасць за лёс совецкай літаратуры, за яе далейшы рост і росквіт. Мне здаецца, што мы не заўсёды адчуваем гэту адказнасць так, як адчувалі яе вялікія творцы літаратуры, як адчуваў яе вялікі пролетарскі пісьменнік Максім Горкі. Ён на працягу ўсяго свайго жыцця ніколі не забываў аб гэтай адказнасці і гэта таму, што ён быў не толькі вялікім пісьменнікам, але ў першую чаргу вялікім грамадзянінам, які хваляваўся за лёс свайго народа, за лёс усяго чалавецтва. Ён верыў у тое, што пісьменнік сваімі творамі дапамагае людзям пазбавіцца ад усяго дрэннага, злога і нізкага, дапамагае чалавецтву ў яго поступе наперад. Таму ён так клапатліва вырошчваў маладыя літаратурныя таленты і так старанна выполваў пустазелле, якое ўзыходзіла на літаратурнай ніве. І ў нашай, беларускай совецкай літаратуры было-б больш дасягненняў і менш недахопаў, каб мы, па прыкладу Аляксея Максімавіча, заўсёды памяталі аб вялікай адказнасці пісьменніка, аб вялікіх задачах літаратуры, каб мы ўмелі ўвязваць нашы задачы з тымі вялікімі задачамі, якія стаяць перад усёй совецкай краінай.

Пры дапамозе партыі і совецкай улады беларуская совецкая літаратура ачысціла свае рады ад ворагаў і дала рад высокіх па сваёй ідэйнай і мастацкай якасці твораў, але супакойвацца на гэтым нельга, бо яшчэ ёсць у нас праявы безыдэйнасці, пошласці, з чым мы павінны жорстка змагацца. Але больш за ўсё ў нас шэрасці. Гэта сёння адзін з галоўных недахопаў у нашай літаратуры, і змагацца з ім не так лёгка, бо ў шэрым творы няма такіх адмоўных праяў, якія-б рэзка выступалі. Тут як-быццам усё ў парадку, усё правільна, бяда толькі ў тым, што такі твор нікога не захапляе і не хвалюе. А раз твор не дайшоў да сэрца чытача, дык гэта ўсёроўна, як яго і зусім не было.

Змагацца з недахопамі, гэта не значыць толькі называць іх. Трэба высветліць прычыны гэтых недахопаў і пастарацца іх ухіліць. Цяжэй за ўсё ўстанавіць прычыны шэрасці таго ці іншага твора. Самае простае і распаўсюджанае тлумачэнне, гэта—адсутнасць таленту. Раз у чалавека няма здольнасці, дык і патрабаваць з яго няма чаго. А, між тым, гэта не заўсёды так, і нашы творы часта стаяць ніжэй нашых здольнасцей.

Памыляецца той, хто думае, што калі ў таго ці іншага маладога ці немаладога пісьменніка выявіліся здольнасці, дык больш і клапаціцца ні аб чым не трэба —высокамастацкія творы з'явяцца самі сабой. Талент пісьменніка, гэта сіла толькі ў патэнцыі, якая можа і не праявіцца ў поўнай меры пры адсутнасці іншых неабходных умоў. Талент пісьменніка я параўнаў-бы з парай. Паверхня мора ў сонечны дзень дае велізарную колькасць пары, але, знаходзячыся ў свабодным стане, гэта пара не дае ніякага эфекту, як рухавая сіла. У той-жа час непараўнана меншая колькасць пары, заключаная ў паравую машыну, дае велізарны эфект карыснага дзеяння.

Каб талент пісьменніка праявіўся ў поўнай меры, для гэтага яшчэ патрэбна, каб пісьменнік быў здольны моцна і глыбока адчуваць. Ён павінен адно моцна любіць, другое—моцна ненавідзець, адным захапляцца, другім абурацца. Але пачуцці чалавека з'яўляюцца ў выніку яго дачынення да навакольнага асяроддзя. Пачуцці совецкага пісьменніка, сіла і характар гэтых пачуццяў залежаць ад таго, як ён адносіцца да совецкай сапраўднасці, наколькі глыбока хвалюе яго ўсё тое, што адбываецца ў совецкай краіне. Такім чынам, мы зноў прыходзім да тае думкі, што сапраўдны пісьменнік павінен быць сапраўдным грамадзянінам, іначай яго творы застануцца толькі літаратурнымі практыкаваннямі і нікога хваляваць не будуць.

Але і гэтага для пісьменніка яшчэ мала. Справа ў тым, што пісьменніку спадзявацца на адно сваё пачуццё, гэта значыць —пусціцца ў плаванне без руля і ветрыл: можна бесканечна кружыцца па бурлівым моры і не даплысці ні да якой гавані. Пачуцці павінны кантраліравацца і накіроўвацца розумам, тады толькі яны зоймуць у творы належнае месца і прывядуць да пажаданых вынікаў. А розум чалавека, гэта не толькі той розум, з якім ён на свет з'явіўся, гэта плюс яшчэ вялікі жыццёвы вопыт, вопыт не толькі яго ўласны, а вопыт усяго чалавецтва, падсумаваны людзьмі навукі і культуры. Чым большы жыццёвы вопыт пісьменніка, чым больш ведаў ён мае, тым хутчэй і правільней ён разбярэцца ў навакольнай рэчаіснасці, тым паўней і ярчэй пакажа яе ў сваіх творах. Адсюль вынікае неабходнасць для пісьменніка пастаяннай і ўпартай вучобы і, перш за ўсё, неабходнасць вывучэння марксізма-ленінізма, які найбольш поўна і правільна сумірue мінулы вопыт чалавецтва і паказвае шлях яго далейшага развіцця.

Шэрымі «мастацкія» творы бываюць і ад таго, што пішуць іх людзі, якія не маюць ніякіх здольнасцей і трапілі ў літаратуру выпадкова. Тут ужо нічога не зробіш і справе не дапаможаш. Адзінае, што можна зрабіць—гэта далікатна параіць чалавеку, каб ён заняўся больш карыснай справай. Але часта бывае, што пісьменнік бясспрэчна таленавіты і ўсімі паважаны, які даў ужо нямала добрых твораў, і той піша і, што горш, друкуе невысокія па якасці творы. Гэта бывае часцей за ўсё тады, калі пісьменнік адчувае, што грамадскасць чакае, каб ён адгукнуўся на тую ці іншую падзею ці з'яву, але самога яго гэта з'ява глыбока не хвалюе. Піша ён таму, што лічыць неабходным пісаць, але гэта неабходнасць не ператварылася ў свабоду, у жаданне тварыць, не ўсвядомлена, не прачута да канца і «творыць» пісьменнік амаль што нехаця. А часам і хвалюе пісьменніка тая ці іншая з'ява, але ён мае аб ёй толькі некаторае ўяўленне і не ведае яе ў канкрэтнасці. У выніку выходзяць у свет творы недапошаныя, бледныя, якія па-сапраўднаму нікога ўсхваляваць не могуць.

Хваліць крытыка такія творы толькі за імя іх аўтара, забываючы на тое, што гэтым яна прыносіць шкоду літаратуры, асабліва, калі ўзяць пад увагу выхаванне маладых пісьменнікаў. Для пачынаючага сталы, паважаны пісьменнік з'яўляецца вялікім аўтарытэтам, а напісаны ім твор — узорам, асабліва, калі ён пахвален крытыкай. Пачынаючы сам вучыцца пісаць такія творы, а пасля яго лаюць за тое, за што старэйшага пісьменніка хвалілі.

Наогул у нас непрынцыповасць у ацэнках літаратурных твораў, а часам і поўная абыякавасць у адносінах да твораў сваіх таварышоў яшчэ мае месца. «Усёроўна, што-б я ні гаварыў, ад гэтага справа не палепшыцца,—думаюць некаторыя малаверы.—Скажаш—чалавек пакрыўдзіцца, нажывеш сабе ворага. Няхай лепш хто іншы скажа». А гэта сведчыць толькі аб тым, што мы часам не адчуваем па-сапраўднаму адказнасці за сваю крэўную справу, што мы, інжынеры чалавечых душ, яшчэ носім у сваёй душы, у сваёй свядомасці перажыткі капіталізма і свой дабрабыт і спакой ставім вышэй такой важнай справы, як развіццё літаратуры цэлага народа.

Ф. Пестрак

БЫЦЬ НЕРАЗДЗЕЛЬНЫМ З НАРОДАМ*

Пісьменнікі мінулых часоў, выходзячы з нетраў народа, ішлі ў жыццё самапасам; многія з іх гінулі; заставаліся больш адпорныя, яны прабівалі сабе і другім дарогу цераз нетры бяспраўя, ілжы, грубасці, насілля, здзеку чалавека над чалавекам. Урады не займаліся лёсам пісьменнікаў. Наадварот, найбольш праўдзівыя мастакі, якія былі звязаны з народнымі масамі, праследваліся ўрадамі капіталістычных краін. Так было з Пушкіным, якога ссылалі на акраіны Расіі, так было з Лермантавым, Дастаеўскім, Шаўчэнкам і інш. Так было з Генрыхам Гейнэ, які быў выгнан урадам з Германіі, і г. д. Не будзем ужо гаварыць аб Міцкевічу, які палову свайго жыцця правёў на чужыне, на выгнанні.

Выхавальнікам пісьменнікаў мінулых часоў былі абставіны і асобныя людзі. Прыгожым прыкладам гэтага з'яўляецца Аляксей Максімавіч Горкі, які з 12-ці год пайшоў у жыццё круглым сіратой. Толькі абставіны і людзі былі тымі выхавальнікамі, якія дапамаглі Горкаму ўзысці на шлях літаратуры і стаць пісьменнікам рабочага класа сусветнай велічыні.

У гісторыі рускай літаратуры мы знойдзем многа прыкладаў, якімі цяжкімі шляхамі прабіраліся пачынаючыя пісьменнікі ў свет літаратуры. Возьмем рускага народнага паэта самародка Кальцова. Маладога Кальцова ў росквіце яго таленту так і зламала грубае, цёмнае асяроддзе ў асобе бацькі-гандляра і эксплаатара, сям'і і акружаючых. Кальцоў перад смерцю, маючы толькі 27 год, піша ўжо верш «Расчет с жизнью»:

...Жизнь, зачем же собой
обольщаешь меня?..

І ў гісторыі беларускага народа мы маем прыклады гібелі маладых паэтаў. Напрыклад, Паўлюк Бахрым, сын прыгоннага селяніна, яшчэ юнаком пісаў:

Зайграй, зайграй, хлопча малы,
І ў скрыпачкі і ў цымбалы,
А я зайграю у дуду.
Бо ў Крошыне жыць не буду,
Бо ў Крошыне пан сярдзіты.
Бацька кіямі забіты...

Ён, следуючы народнаму павер'ю, прасіць кажана сесці на яго, каб ён не вырас, а тады яго не возьмуць у салдаты:

Ой, кажане, кажане,
Чаму не сеў ты на мяне,
Каб я большы не падрос
Ды ад бацькавых калёс...

Урад Нікалая I схапіў маладога паэта і аддаў на 25 год у салдаты, дзе ён і загінуў.

Многа можна было-б ілюстрыраваць прыкладамі аб бяздольным становішчы паэтаў, пісьменнікаў розных народаў у мінулыя часы, дзе ўсе перадавыя людзі часу задыхаліся ў атмасферы «мракабесся», а многія паміралі, не расцвіўшы. Мачыхай быў для іх лёс.

А цяпер мы дажылі да таго шчаслівага часу, аб каторым марылі ўсе лепшыя людзі ўсіх народаў, якія надрываліся пад цяжарам часу, скіроўваючы свой зрок у тое далёкае для іх будучае, у каторым чалавецтва знойдзе шчасце. Думаў аб гэтым Пушкін, калі казаў:

Увижу-ль я народ неугнетенный
И рабство падшее и падшего царя?

Думаў аб гэтым Некрасаў, калі казаў:

Эх! Эх! Придет ли времячко,
Когда мужик... Белинского и Гоголя
С базара понесет?

Нам на долю прыпала дачакацца гэтага часу!

Вызваленыя працоўныя масы былой царскай Расіі — гэта мільёны людзей, якім адкрыліся вочы пасля слепаты. Ажыццявілася мара ўсіх прасвяціцеляў: народная асвета стала здабыткам усіх. Які-ж павінен быць наш энтузіязм пры наліччы такіх грандыёзных дасягненняў соцыялістычнага будаўніцтва, пры наліччы такога грамадскага ладу, пры якім адкрыты ўсе магчымасці для задавалення ўсіх патрэб працоўных. Якім-жа павінен быць наш энтузіязм, калі мы бачым, што героем нашых дзён з'яўляецца сам працоўны народ у сваёй кампактнай масе, што ідэі комунізма — вучэнне Маркса — Энгельса—Леніна—Сталіна стала здабыткам працоўных, стала магутнай зброяй, рычагом у барацьбе за новы свет, за комунізм. Вучэнне аб соцыялізме — комунізме апанавала масамі і стала непераможнай сілай. Аб гэтым сведчыць нам увесь працэс Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, калі ў неймаверных труднасцях і злыбедах узброеныя рабочыя і сяляне з імем Леніна на вуснах ішлі ў бой з ордамі буржуазіі, з імем Леніна паміралі, перамагалі і перамаглі. Але рэвалюцыя адбылася ў былой царскай Расіі, краіне вельмі адсталай, дзе было 80 проц. непісьменных, дзе жыло каля 200 нацыянальнасцей. Гэта ўсё перайшло ў спадчыну соцыялізму. З гэтымі масамі, выхаванымі ў прыгнёце, ганеннях, эксплаатацыі, у цемры і беднасці, пачалося будаўніцтва соцыялізма. Гэтыя масы прынеслі з сабой векавыя навыкі, звычаі, прывычкі, характары, якія несумясцімы з патрабаваннямі будаўніцтва соцыялізма. Ленін казаў, што мы не будзем чакаць таго часу, калі чалавек стане лепшым, дасканалейшым, што мы пачнём будаваць соцыялізм з такімі людзьмі, якія ёсць, хоць гэта і не лёгка.

У перавыхаванні чалавека вялікае месца займаюць людзі мастацкага слова, людзі пяра — пісьменнікі, паэты, крытыкі. Вось тут мы і сустракаемся з пытаннем маральнага аблічча пісьменніка. Выхаванне пісьменніка, яго рост не залежаць у нас ад выпадка ў жыцці. У выхаванні пісьменнікаў прымае жывы ўдзел партыя, урад, таварыш Сталін, каб кожнага зрабіць сынам нашай вялікай эпохі. Гэта-ж не тыя часы няволі, аб якіх мы гаварылі ў пачатку, калі пачынаючы пісьменнік быў аддадзен на ласку і няласку лёсу. Маральнасць нашага совецкага пісьменніка — гэта маральнасць соцыялізма. Як у народзе гняздзяцца яшчэ астаткі псіхікі, узгадаванай пры капіталістычным ладзе, так гняздзяцца яны і ў душах некаторых нашых пісьменнікаў. Твор пісьменніка — гэта споведзь яго душы. Значыць, і ў творы некаторых пісьменнікаў немінуча ўкрадуцца сімпатыі да чаго-небудзь старога, якое нам непатрэбна, якое асуджана ходам гістарычных падзей. Каб творы нашага пісьменніка адпавядалі вымаганням часу, неабходна перабудаваць душу самога пісьменніка.

Чым-жа яе перабудаваць? Дзе-ж знайсці такое лякарства? Усім вядома, што пісьменнік павінен быць чалавекам універсальным, павінен свядома-разумна падыходзіць да кожнай рэчы і кожнай з'явы. Як праўдзівы мастак, ён павінен рэагіраваць на ўсё, што знаходзіцца ў полі яго зроку. Які-ж крытэрый павінен мець наш пісьменнік у ацэнцы жыцця, наогул кажучы? Падставай крытэрыя з'яўляецца светапогляд Маркса—Энгельса —Леніна—Сталіна. Гэты светапогляд на справе даказаў сваю навуковасць, ён пацвярджаецца самым жыццём.

Без марксісцка-ленінскага светапогляду не можна быць поўнакроўным совецкім пісьменнікам. Гэта першае, што нам патрэбна.

Маючы за сабой марксісцка-ленінскі светапогляд, здабываеш магчымасць актыўнага ўплыву на жыццё, на выхаванне людзей у духу комунізма.

Маючы правільную ацэнку нашых дзён, совецкі пісьменнік павінен вывучаць чалавека ў нашым быту. Белы аб чалавеку Горкі лічыў асновай мастацтва.

Пісьменнікі старых часоў жылі ў разладзе з рэчаіснасцю. Рэчаіснасць была горкая, чорная, яны змагаліся з ёю. Адгэтуль і вырас крытычны рэалізм. Крытычны рэалізм быў крытыкай падстаў грамадскага ладу, самога фундамента і ўсяго таго, што на ім вырасла. У нас, пры совецкай рэчаіснасці няма патрэбы ў тым, каб крытыкаваць самыя асновы, бо гэтыя асновы скіраваны на тое, каб ашчасліўіць кожнага чалавека. Мы павінны крытыкаваць усё тое, што супярэчыць гэтым асновам, што засталося ў душах людзей, як спадчына ад капіталістычнага ладу. У крытычным рэалізме вялікай была сіла крытыцызма, «адмаўлення», але малой была сцвярджаючая сіла. Усе згаджаліся з тым, што, напрыклад, асновы царызма згубны для людзей. Але калі ўставала пытанне, што лічыць харошым, дзе выхад з гэтага, то даваліся розныя адказы ў залежнасці ад палітычна-філасофскіх поглядаў таго ці іншага пісьменніка.

Наш рэалізм — соцыялістычны рэалізм, які апрача сілы крытыцызма, мае вялікую сцвярджаючую сілу, бо ён узброен правільнай тэорыяй і практыкай марксізма-ленінізма.

Ці няма ў нашым быту людзей, у якіх існуе разлад між сабою і нашай рэчаіснасцю? Вядома, такія людзі ёсць. Адны з іх любяць толькі крытыкаваць і больш нічога не робяць; у другіх сваё прыватнае становішча займае больш увагі, чым грамадскія справы, і г. д.

Гэтыя людзі не разумеюць сцвярджаючай сілы нашага часу, не разумеюць дастаткова сутнасці працэсу і яго крыніцы — марксізма-ленінізма, які вучыць перабудоўваць жыццё пастаянна на карысць і выгоду чалавека.

Дзеля таго ад пісьменніка патрабуецца пастаянная чуткасць да кіруючай ідэі часу, каб гэтай ідэі не засцямілі яму ніякія хвалі. А быць чуткім да кіруючай ідэі часу, гэта значыць — быць верным гэтай ідэі, гэта значыць — мацаваць яе словам і справай, гэта значыць — любіць яе. Для праўдзівага мастака адкрываецца вялікае поле дзеяння, непачаты куток працы.

«Мастацка-праўдзіва» — павінна быць лозунгам кожнага з нас. Мы павінны помніць, што «кожная асоба — гэта тып, але разам з тым гэта зусім акрэсленая асоба», якая мае і свае індывідуальныя рысы. Нельга схематызіраваць сваіх герояў — гэта будзе ілжыва. Гэта не будзе мастацтва, а халтура. У нас, у совецкім пісьменніцтве часта грамадская схема дзейнасці людзей прымзецца за нарыс яго характару, г. зн. ствараюцца людзі без твару. Кожны чалавек, які хоча не з'яўляецца простым, як механізм, — кожны чалавек — гэта комплекс перажыванняў, дзеяння, рэзультат выхавання і г. д. А. М. Горкі казаў: «Нам не трэба апрашчаць сёненшняга бытавога чалавека. Мы павінны паказаць яго самому сабе ва ўсёй яго прыгажосці, яго ўнутранай заблытанасці і раздробленасці, з усімі супярэчнасцямі сэрца і розуму».

Не трэба схіляць сябе да якіх-небудзь тэм, насілаваць сваю фантазію — у мастака тэмы родзяцца ў працэсе ўспрымання жыцця. Не ўпадаць у фармалізм. Змест і форма неразлучныя. Справа не ў тым, каб пісаць хутка альбо павольна, але трэба пісаць добра. Пісьменнік павінен адчуваць сябе свабодным у сваёй творчасці, не шукаць «цудаў», вычурнасцей, а пісаць проста, як яму падказвае яго свядомасць і пачуццё.

Белінскі з гэтага повада казаў: «Свабода творчасці лёгка ўзгадняецца са служэннем сучаснасці. Для гэтага не трэба прымушаць сябе пісаць на тэмы, насілаваць фантазію, для гэтага трэба толькі быць грамадзянінам, сынам свайго грамадства і сваёй эпохі, засвоіць сабе яго інтарэсы, зліць свае імкненні з яго імкненнямі; для гэтага патрэбна сімпатыя, здаровае практычнае пачуццё ісціны, якое не аддзяляе перакапання ад справы, твора ад жыцця». Белінскі гаварыў з глыбіні XIX стагоддзя, але словы яго актуальны і жывы цяпер.

«Быць пісьменнікам — значыць, быць чалавекам у самым высокім і прыгожым яго значэнні. А быць чалавекам — значыць, быць нераздзельным з народам у працы, горасцях і радасцях яго». (А. М. Горкі). Вось за такога пісьменніка мы будзем штодзённа змагацца.

*) З даклада, прачытанага на сходзе совецкіх пісьменнікаў Беластока 5 кастрычніка 1940 года.

ДЗЕЙСНА РЫХТАВАЦЦА ДА ЎСЕСЮЗНАГА АГЛЯДУ

Абвешчаны Камітэтам па справах мастацтваў пры СНК СССР Усесаюзны агляд тэатральнай самадзейнасці выклікаў вялікую хвалю творчага ўздыму ў самадзейных тэатральных калектывах. За апошнія два-тры месяцы па рэспубліцы арганізавана звыш сотні новых драматычных гурткоў, аднавілі сваю работу гурткі, якія перасталі былі прававаць. Рост тэатральных гурткоў асабліва назіраецца ў заходніх абласцях БССР.

У Вілейскай вобласці зараз працуе некалькі дзесяткаў тэатральных калектываў. Радашковіцкі тэатральны калектыў настаўнікаў рыхтуе к агляду «Гразу» А. Астроўскага, міёрскі — «Беднасць не парок» А. Астроўскага, курынецкі — «Платон Крэчат» А. Карнейчука і «Голдгрэбер» Шолам-Алэйхема на яўрэйскай мове. Драмгурток Нікалаеўскага сельсовета рыхтуе к агляду п'есу «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка.

Гурток в. Цынцэвічы, Курынецкага раёна, са снежня 1939 года паставіў п'есы «На варце», «Шахматная партыя», «Мапі байпа» і інш. У гуртку працуе 20 чалавек. Кіруе гуртком селянін тав. Крупько.

Ашмянскім гуртком кіруе рахункавод тав. Салярчык. Гурток паставіў п'есы «Залатыя рукі», «Шахматная партыя», «Пагібель «Надзеі», урыўкі з «Партызанаў», «Доктар» і «200 тысяч» Шолам-Алэйхема, «Ойлом-табэ» і інш.

Па Вілейскай вобласці рыхтуюцца да Ўсесаюзнага агляду 24 гурткі тэатральнай самадзейнасці.

У Брэсцкай вобласці працуе 85 тэатральных гурткоў. Лепшым у вобласці лічыцца тэатральны калектыў клуба Гайнаўскага лесазавода. Гуртком кіруе рабочы тав. Секержыцкі. Са студзеня 1940 года гуртком пастаўлены «Юбілей» і «Мядзведзь» А. Чэхава, «Лес» А. Астроўскага і іншыя спектаклі. Тэатральны калектыў гарадскога пасёлка Клешчэлі, якім кіруе сакратар сельсовета тав. Шчэрбань, паказаў спектаклі «Ой, не ходы, Грыцю» Старыцкага, «Цыганы» па А. Пушкіну і рыхтуе «Славу» В. Гусева. Плённа працуе адзін са старэйшых яўрэйскіх гурткоў у Пружанах, які існаваў у Польшчы на нелегальным становішчы (кіраўнік тав. Глейзер). Гэты гурток ажыццявіў пастаноўкі «Тэв'е малочнік», «Гершэле Остраполер», «200 тысяч». У гуртку поплеч з моладдзю працуюць і старыя. У спектаклях гэтага гуртка ўдзельнічаюць дублёры з маладых удзельнікаў.

Па вобласці ва Ўсесаюзны агляд уключылася 70 тэатральных калектываў.

Па Мінскай вобласці ў агляд ўключылася 30 калектываў. З палітінспектарамі і загадчыкамі дамоў соцкультуры праведзены дзве лекцыі па пытаннях работы над п'есай. Пры ўдзеле прафесіянальных актораў зроблен разбор спектакляў «Беднасць не парок» А. Астроўскага (клуб ім. Горкага, Барысаў), «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы (чэрвеньскі ДСК), «Чужы» Гордзіна (клуб прамкааперацыі, Барысаў), «Базілевічава сям'я» К. Чорнага (зембінскі і астрашыцкі ДСК) і інш. Пасапраўднаму рыхтуюцца да агляду тэатральныя калектывы фабрыкі імя Кагановіча (Мінск), пімкавіцкага ДСК, торфазавода імені Орджанікідзе (Смалявічы), клуба імені Горкага і прамкааперацыі ў Барысаве, чэрвеньскага і бягомльскага ДСК і інш.

Нас здзіўляе, што па Віцебскай вобласці ў агляд уключылася толькі 15 калектываў. Віцебскі Дом народнай творчасці зарэгістрыраваў толькі 57 калектываў, хоць у вобласці іх значна больш — да 197. Лепшыя гурткі вобласці, гурткі клуба Медсанпрацы, фабрыкі імя Кагановіча, фанернага завода, фабрыкі імя Клары Цэткін і інш. разгарнулі дзейсную падрыхтоўку да агляду. Гарадскім калектывам значную дапамогу аказвае Віцебскі Дзяржаўны драматычны тэатр. Так, нар. артыст БССР П. Малчанаў кансульціруе пастаноўку драматычнага калектыва клуба Медсанпрацы «Голдгрэбер» Шолам-Алэйхема, засл. артыст БССР Ц. Сяргейчык — спектакль драмкалектыва клуба імені Клары Цэткін «Мая любімая» Левіна і інш.

132 драматычных калектывы працуюць у Магілёўскай вобласці. Домам народнай творчасці праведзен абласны семінар, на якім прысутнічала 52 чалавекі. На семінары аб майстэрстве актора, рабоце над п'есай і роляю чыталі лекцыі рэжысёры Дзяржаўнага Рускага драматычнага тэатра БССР нар. артыст БССР Д. Орлоў, Мееровскі, Валенцінаў, актор Перверцень. Лепшым драматычным калектывам вобласці лічыцца нагнічскі. Пачаў сваю работу, гурток з вадэвіля «Прымакі» Я. Купалы. За час свайго існавання драмкалектыў паказаў гледачам «Валасны суд» Лебедзева, «Падкідыш» Квасніцкага, «Партызаны» Крапівы, «Цыганы» па Пушкіну, «Не было ні гроша, ды раптам алтын» А. Астроўскага. Да агляду гурток рыхтуе спектакль «Сады цвітуць» Масса і Кулічэнкі.

Аднак, падрыхтоўка да агляду праходзіць яшчэ марудна. Да гэтага часу не ўсюды перабудавана работа па-новаму, у адпаведнасці з апошняй пастановай пленума ВЦСПС. Адмена платных кіраўнікоў тэатральнымі гурткамі мастацкай самадзейнасці не павінна адбіцца на рабоце мастацкай самадзейнасці. Дом народнай творчасці БССР недастаткова дзейсна ажыццяўляе рашэнні апошняга пленума ВЦСПС. Рэпертуар таксама адбіраецца і прапануецца гурткам не заўсёды ўдала, інакш не трапіла-б антымастацкая аднаактоўка М. Ільінскага «Месія» ў рэпертуар пімкавіцкага гуртка.

Справа падрыхтоўкі да Ўсесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці — справа ўсёй грамадскасці. Гэты агляд дасць магчымасць выявіць сапраўдныя таленты, уліць свежыя маладыя сілы ў прафесіянальныя тэатральныя калектывы. Часу-ж да пачатку першага тура — 15 снежня — засталося мала. І таму раённыя, абласныя і цэнтральныя аглядавыя камісіі, Дамы народнай творчасці, палітінспектары, шэфы самадзейнасці павінны аказваць максімум увагі драмкалектывам у іх рабоце. К агляду тэатральныя калектывы павінны прыйсці з выдатна падрыхтаванымі спектаклямі.

А. АСТРЭЙКА.

Студыя «Саюздзетфільм» рыхтуе мастацкі гукавы фільм «Першадрукар Іван Фёдараў», здыманне якога адбываецца ў храме Васіля Блажэннага ў Маскве. Аўтар фільма Е. Вейсман, рэжысёр Г. Леўкоеў. **На здымку:** Артыст Г. Белоў у ролі дзяка Барценьева.

Фота Н. Аляксеева (ТАСС).

«Крэмлёўскія куранты» Н. Пагодзіна ў Дзяржаўным Рускім драматычным тэатры БССР. У ролі Леніна — нар. артыст БССР **Д. Орлоў**, у ролі Сталіна — арт. **Ю. Орынянскі**, у ролі Дзяржынскага — арт. **В. Вінаградаў**.

Фота тэатра.

СТВАРЫЦЬ УМОВЫ ДЛЯ РАБОТЫ АНСАМБЛЯ

Кіраўнік ансамбля песні і пляскі Беластоцкай Дзяржаўнай філармоніі Рыгор Раманавіч Шырма добра вядомы працоўным заходніх абласцей БССР, — ён праводзіў тут вялікую работу ў змрочныя годы панскага іга. Азіраючыся па баках, каб не трапіць на вочы шпіцлю ці паліцэйскаму, Рыгор Шырма хадзіў з адной вёскі ў другую і збіраў залатыя россыпы беларускай народнай творчасці. Ён сабраў багацейшыя фальклорныя матэрыялы, у якіх паднявольны народ выказваў свае надзеі і чаканні, свае пачуцці і думкі.

Лепшыя песні кампазітары перакладалі на музыку, і яны зноў вярталіся ў народ. Песня «Нарачанка» была шырока вядома ў Заходняй Беларусі. Яе распявалі нарачанскія рыбакі, падымаючыся на паўстанне супроць прыгнятальнікаў.

На кватэры Р. Шырмы збіраліся студэнты і беспрацоўныя — гарачыя любіцелі народнага мастацтва. Тут-жа рэпетыравалі свой рэпертуар і «выступалі». Публічныя канцэрты дазваляліся толькі два разы ў год, ды і то спяваць на іх прыходзілася ўпоўголаса. Песні Янкі Купалы і Якуба Коласа былі забаронены. Лепшыя народныя спевы з праграмы канцэртаў выкрэсліваліся.

Многія ўдзельнікі хора, ды і сам Шырма, былі беспрацоўнымі. Цяперашні балетмейстар ансамбля Іван Хвораст — чалавек з вышэйшай адукацыяй — пасля доўгіх год беспрацоўя дабіўся, нарэшце, пасады касіра на гарадскім катку. Саліст хора Савіцкі працаваў чорнарабочым каналізацыі.

Шырма любоўна расціў кадры беларускага мастацтва. Ён-жа на грошы, сабраныя сярод сялян і беларускай інтэлігенцыі, выдаў зборнік вершаў Максіма Танка «На этапах». На вокладцы кнігі быў намаляван беларускі пейзаж, праніззаны штыхам. У зборніку былі змешчаны вершы, поўныя рэвалюцыйнага пафасу, веры ў скорае з'яднанне з усходнімі братамі. Кніга была канфіскавана. Паэта пасадзілі ў турму, а выдаўца пацягнулі ў паліцэйскі ўчастак.

Гераічная Чырвоная Армія вызваліла заходнебеларускія прасторы з-пад панскага бота. Адкрылася сонечная старонка ў развіцці беларускага мастацтва.

З энтузіязмам узяўся Шырма за любімую справу, калі на вольнай совецкай зямлі яму даручылі арганізаваць ансамбль беларускай песні і пляскі. Ён адразу-ж накіраваўся ў вёскі, дзе некалі збіраў фальклор, слухаў мілагучныя спевы хлапцоў і дзяўчат. Ён адбіраў спевакоў для ансамбля. У лютым мінулага года малады калектыў пачаў сваю працу.

З першых дзён ансамбль становіцца любімым госцем у рабочых, вясковых і чырвонаармейскіх аўдыторыях.

Незабыўнае ўражанне засталося ва ўсіх удзельнікаў ансамбля ад паездкі ў Мінск, дзе яны былі горача сустрэты грамадскасцю сталіцы, з поспехам выступалі перад дэлегатамі XVIII з'езда КП(б)Б.

У лічаныя месяцы, дзякуючы працавітасці, адданасці і любві да сваёй справы арганізатара і кіраўніка ансамбля тав. Шырмы і яго памочнікаў — балетмейстра І. М. Хвораста і педагога танцаў А. Н. Рэйзер, ансамбль стварае багаты, разнастайны па сваёй жанравай яркасці, па мастацкаму майстэрству рэпертуар.

Слухаючы канцэрт ансамбля, проста дзіву даешся, як за такі кароткі час толькі-што народжаны калектыў дасягнуў мастацкай гарманічнасці, набыў лепшыя рысы прафесіянальнага майстэрства. Беларускія, рускія, польскія песні і танцы. Старыя і сучасныя. І колькі ў іх сапраўды смелага творчага размаху, ініцыятывы, арыгінальнасці і выдумкі! Самае лепшае, што ў гэтым калектыве баяцца руціннай «самабытнасці», малейшай прымітывізацыі народнай творчасці, а стараюцца перадаць кожны танец, кожную песню ва ўсёй іх чаруючай прыгажосці, мастацкай яркасці.

Побач з запасам народных песень ансамбль пашырае свой рэпертуар за лік лепшых твораў класічнага і сучаснага рускага мастацтва (хор з оперы «Дэман», творы кампазітараў Александрава, Дунаеўскага і іншых). Цяпер калектыў рыхтуе ўрыўкі з выдатнай беларускай оперы «Кветка шчасця» Туранкова, развучвае лепшыя польскія народныя песні і танцы.

Шчырыя сімпатыі, сардэчную ўвагу заваяваў таленавіты калектыў у шырокай совецкай грамадскасці. Але ніяк не можа дабіцца ён увагі ад Беластоцкага абласнога аддзела мастацтваў. Мы ўжо не будзем гаварыць пра тое, што асобныя «дзеячы» з абласнога ўпраўлення мастацтваў перашкаджалі ў рабоце ансамбля. Умяшанне абкома партыі рашуча змяніла адносіны да ансамбля. Аднак і на сёння засталіся рэшткі безуважнасці аддзела мастацтваў і абласной філармоніі да яго. Ансамбль не мае свайго сталага памяшкання, не створаны адпаведныя ўмовы і для яго артыстаў. У самім калектыве адсутнічае патрэбная ідэйна-выхаваўчая работа, не вядзецца агульна-адукацыйнай вучобы.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР выказвае сваю ўвагу да ансамбля пакуль-што аднымі добрымі загадамі, не клапоцячыся аб іх ажыццяўленні.

Творчасць маладога калектыва, яго мастацкае значэнне заслугоўваюць самай шырокай папулярызацыі. Час падумаць аб тым, каб пазнаёміць з яго выступленнямі, з яго творчасцю грамадскасць усіх культурных цэнтраў Совецкай Беларусі.

Ц. КРЫСЬКО, Т. ЛЯСОВЫ

Беласток.

РЭПЕРТУАР ВІЦЕБСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА

Віцебскі Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр уключыў у рэпертуар 1941 года п'есы: «Вішнёвы сад» А. П. Чэхава, «Дванаццатая ноч» В. Шэкспіра, «Анна Лучыніна» К. Трэнёва, «Несцерка» Віт. Вольскага, новыя п'есы Пятра Глебкі, Кузьмы Чорнага.

Рэпертуар надзвычай складаны. Але гэта не выпадковы набор п'ес сусветнай, рускай і арыгінальнай драматургіі. Калектыў перакапан, што на даным этапе творчага развіцця тэатра іменна гэты рэпертуар арганічна неабходзен і прадстаўляе сабою той матэрыял, які дае акторам і рэжысуры магчымасці ідэйна-мастацкага росту, перспектыву творчых пошукаў і дзярзанняў і велізарную цікавасць для гледача.

Самае цікавае і радаснае ў тым, што тэмы, над якімі зараз працуюць для тэатра беларускія драматургі, узяты з хвалюючай і яркай рэчаіснасці. Гэта тэмы значныя і патрэбныя, якія расказваюць аб фарміраванні новага чалавека, новай соцыялістычнай маралі і этыкі, тэмы, якія даюць шырокі прастор акторскай і рэжысёрскай творчасці.

Але гэтым не вычэрпваецца спіс п'ес аб совецкай рэчаіснасці. Па-за вырашэннем сучасных праблем, па-за работай над сучаснымі п'есамі, у якіх жыве «разумная душэўная назіральнасць» (Горкі), тэатр не мысліць сваёй работы. Больш блізка да гэтых патрабаванняў п'еса «Анна Лучынiна» К. Трэнёва. Але калі ў выніку конкурса на лепшую п'есу паявяцца больш дасканалыя і яркія творы, дык тэатр заменіць яе новымі.

Гэты рэпертуар не толькі дае магчымасць замацаваць поспехі, дасягнутыя ў мінулым, але і развіць дасягнутае і прыйсці да надыходзячага 20-годдзя тэатра са значнымі творчымі поспехамі. «Вішнёвы сад», «Дванаццатая ноч» і «Несцерка» — юбілейныя спектаклі, г. зн. спектаклі, якія павінны прынесці тэатру такія поспехі, якія будуць сведчыць аб росце яго мастацкай спеласці.

У 1941 годзе тэатр пакажа не менш 9-ці прэм'ер. Выкананне плана забяспечваюць творчая арганізаванасць і поўная загрузка калектыва. Пасля работы над «Прывідамі» і «Атэстатам сталасці», якія будуць выпушчаны ў кастрычніку, тэатр прыступіць да работы над «Ірынкай» К. Чорнага.

Калі рэпертуарам тэатр ставіць перад сабою задачу творчага росту, вызначае сваё ідэйна-мастацкае накіраванне, дык сцэнічным увасабленнем ён гэту задачу вырашае. На багатым рэпертуары 1941 года тэатр будзе імкнуцца выкарыстаць вопыт, майстэрства сваіх лепшых акцёраў, поспехі росту моладзі для паглыблення рэалістычнага метаду работы тэатра.

На гэтай плодатворнай аснове тэатр будзе шукаць новых граней у сваёй творчасці, і калі яму ўдасца адшукаць новыя формы, новыя мастацкія асаблівасці, дык гэта будзе сведчыць аб яго росце. Аднак, тэатр не ставіць перад сабою задачу абавязковага і шпаркага асваення рамантызма. Гэта работа павінна быць паслядоўнай і арганічнай. Былі ў тэатры рамантычныя спектаклі «Гібель эскадры», «Пад Бярозай-ракой». Яны мелі поспех і знаменавалі сабою рост таму, што яны з'явіліся арганічным вынікам творчых пошукаў. І «Дванаццатая ноч» і «Каварства і любоў» даюць новыя вялікія магчымасці для стварэння рамантычных спектакляў. І к гэтаму будзе імкнуцца тэатр.

Рэпертуар 1941 года—план вялікай работы па ўдасканаленню майстэрства актораў, умацаванню сувязей з гледачом.

І. ДОРСКІ.

Вынікі гастролей

1940 год — год цікавай творчай работы Тэатра юнага гледача БССР. Амаль палову гэтага года тэатр гастраліраваў па гарадах і раёнах нашай рэспублікі.

130 спектакляў і 65 тысяч гледачоў! Такі вынік гастрольнага падарожжа. Тэатр з асаблівым хваляваннем і радасцю выступаў перад гледачамі Брэста, Гродна, Беластока, Пружан і Гайнаўкі.

У часе гастролей тэатр паказаў сваю прэм'еру — «Казку» Міхаіла Святлова аб марах, дружбе, любві совецкай моладзі.

Вялікую грамадскую работу правёў калектыў тэатра ў школах. У часе гастролей у Гродні група актораў тэатра выязджала з канцэртам у дзіцячыя дамы і піонерскія лагеры.

5 кастрычніка адбылася сустрэча актораў тэатра з педагогамі і вучнямі Беластока, прысвечаная абмеркаванню спектакля «Як гартавалася сталь». У гутарцы юныя гледачы выказвалі свае заўвагі па спектаклю, цікавіліся творчай работай тэатра. Канцэртная брыгада тэатра з поспехам выступала на прызыўных пунктах перад новым папаўненнем нашай слаўнай Чырвонай Арміі.

13 кастрычніка ў Беластоку Тэатр юнага гледача БССР закончыў свае гастролі па заходніх абласцях. На адбыўшайся сустрэчы калектыва тэатра з пісьменнікамі і грамадскасцю Беластока прысутныя высока ацанілі работу тэатра, яго спектаклі «Цудоўная дудка», «Як гартавалася сталь», «Снежная каралева». Калектыў тэатра пазнаёміў грамадскасць Беластока са сваёй новай п'есай аб совецкай школе — «На парозе жыцця» Н. Таўбэ.

Зараз тэатр рыхтуецца да Усесаюзнага агляду дзіцячых тэатраў, які пачнецца 15 лістапада ў Маскве. На аглядзе тэатр пакажа свой лепшы спектакль — «Цудоўную дудку» В. Вольскага ў новым афармленні мастака О. П. Марыкса. К гэтай-жа даце тэатр рыхтуе дзве прэм'еры: «Плутні Скапэна» Мальера ў пастаноўцы рэжысёра В. Я. Мееровскага і «На парозе жыцця» Н. Таўбэ ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка М. М. Сухарава.

Паездка тэатра ў Маскву натхняе калектыў тэатра да далейшых творчых поспехаў, да стварэння новых высокамастацкіх спектакляў. Такімі спектаклямі намечаны: «Большэвік» Даля (п'еса прысвечана мужнаму большэвіку Якаву Свердлаву), «Снягурачка» Астроўскага, «Сон у летнюю ноч» Шэкспіра, новая п'еса Ольгі Форш аб маленстве вялікага пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага.

Работа над лепшымі ўзорамі сусветнай і сучаснай драматургіі падагуліць 10-гадовы творчы шлях Тэатра юнага гледача БССР.

В. СТЭЛЬМАХ.

Студыя «Саюздзетфільм» рыхтуе новы камедыйны фільм «Стары двор» па сцэнарыю В. Немаляева і Л. Ладыгінай, рэжысёр Немаляеў. **На здымку:** Юныя акторы Лёша Шварц і Вова Таварноў у ролі блізняцоў і засл. артыст РСФСР ордэнаносец М. Румянцаў (Каран д'Аш) у ролі ўпраўдома.

Фота В. Малышава (ТАСС).

Спектакль аб Леніне

„Крэмлёўскія куранты“ Н. Пагодзіна ў Дзяржаўным Рускім драматычным тэатры БССР

Гэтымі днямі ў Дзяржаўным Рускім драматычным тэатры БССР (Магілёў) адбылася прэм'ера «Крэмлёўскіх курантаў» Н. Пагодзіна. Прэм'ера прайшла з вялікім поспехам.

Пастаноўка п'есы «Крэмлёўскія куранты»—падзея велізарнай важнасці для маладога калектыва. Спектакль гэты — этап у жыцці нашага Рускага драматычнага тэатра.

Перад совецкай драматургіяй і тэатрам стаіць сур'ёзнейшая задача стварэння станоўчых вобразаў людзей нашай эпохі. Над стварэннем гэтых вобразаў працуюць многа і ўпарта, але часам гэта работа суправаджаецца зрывамі. Не мінуў зрываў і Рускі драматычны тэатр. Пастаноўка яўна ілжывай п'есы «Загавор»—сур'ёзны зрыў тэатра. У п'есе «Загавор» ёсць рад так-званых «станоўчых» вобразаў, якія нас ні ў чым не пераконваюць, з якімі мы не згодны, але якія на сцэне выдаваліся за вобразы людзей совецкай рэчаіснасці. А хто-ж як не творчы калектыў, прымаючыся за п'есу і працуючы над стварэннем вобразаў, выведзеных у ёй, мог адчуць усю іх ілжывасць і непраўдападобнасць становішча. Для гэтага трэба было толькі больш сур'ёзна, з большай свядомасцю і адказнасцю падыйсці да работы.

У рэпертуары тэатра дасюль не было значных п'ес аб людзях нашага часу. І калі падыйсці к тэатру з гэтага боку, дык робіцца зразумелым, наколькі сур'ёзным выпрабаваннем для тэатра з'явілася пастаноўка «Крэмлёўскіх курантаў»—п'есы аб правадырах нашай партыі, аб перадавых людзях. А зараз, калі п'еса паспяхова пастаўлена, мы можам гаварыць аб тым значэнні, якое яна будзе мець для тэатра.

«Крэмлёўскія куранты» у Рускім драмтэатры—гэта спектакль аб Леніне ў поўным сэнсе гэтых слоў.

Сама п'еса мае шмат істотных недахопаў, што ўскладняе яе пастаноўку на сцэне. Многакарціннасць, адсутнасць канцовак у карцінах, адсутнасць адзінага звязваючага дзеяння, інтрыгі, ухіл у жанравасць, недастатковая закончанасць некаторых вобразаў,—усё гэта не можа не адбіцца на спектаклі. Ад пастаноўшчыка тут залежыць вельмі многае. І трэба сказаць, што пастаноўшчык «Крэмлёўскіх курантаў» тав. Владычанскі справіўся са сваёй задачай. У спектаклі «Крэмлёўскія куранты», нягледзячы на кампазіцыйную нястройнасць п'есы, адчуваецца адзіная сувязь, адзіная рэжысёрская мысль. Владычанскі пазбегнуў небяспекі пайсці па лініі жанравай камедыі, што мы бачылі ў іншых тэатрах. Ён здолеў надаць спектаклю лірыка рамантычнае гучанне, яго менш за ўсё цікавяць бытавыя і жанравыя дробязі дваццатых год. Ён стварае вялікі спектакль аб Леніне, аб новых людзях.

Ролю Леніна выконвае народны артыст БССР Д. А. Орлоў.

Мы бачылі рад выканаўцаў ролі Леніна і многімі з іх былі не задаволены. Гэта, галоўным чынам, было таму, што акторы, імкнучыся да больш праўдзівага адлюстравання вобраза Леніна, ішлі па лініі найменшага супраціўлення. Яны стваралі вонкавае аблічча Ільіча больш ці менш удала схватвалі яго асобныя рухі, позы, дыкцыю, але праходзілі міма галоўнага— унутраных ленінскіх якасцей: сілы, веліччы, чалавечнасці, абаяльнасці, чаго ніяк не перадасі позай, жэстам і іншымі вонкавымі прыёмамі. Вывучаць усё ўласцівае Леніну—жэсты, дэталі, прывычкі і т. п. несумненна трэба і ўсё гэта павінна быць толькі дапаможным матэрыялам для стварэння вобраза вялікага Леніна.

Кожны з нас, нават хто ніколі не бачыў Леніна, носіць у сабе яго вобраз, уяўленне аб ім па яго працах, справах. Гэта—уяўленне народа аб ім. Яно і з'яўляецца тым галоўным, з чаго павінен выходзіць актор у рабоце над вобразам Леніна.

Некаторыя выканаўцы, імкнучыся паказаць ленінскую прастату, чалавечнасць, раздрабляюць гэты вобраз, зніжаюць яго веліч. Ленінская прастата і чалавечнасць—асаблівыя. Аб Леніне можна сказаць словамі Казанка з «Крэмлёўскіх курантаў»: «Ён адзін, самастойны. Такіх другіх няма». Ленінскае аблічча робіцца больш ясным тады, калі мы ад дэталей і дробязей адыходзім на адлегласць. Уменне адыйсціся на адлегласць для таго, каб больш убачыць, даступна не кожнаму, а толькі сапраўды таленавітаму і разумнаму актору. Такі актор можа наблізіцца да стварэння вобраза Леніна.

Д. А. Орлоў не клапоціцца аб стварэнні вонкавага рысунка падабенства з Леніным. Гэта падабенства прыходзіць само, ад тых унутраных ленінскіх якасцей, якія пасцігае Орлоў. Орлоў стварае надоўга запамінаючыйся вобраз Ільіча. Ён набліжаецца да стварэння вобраза Леніна ў яго шматвобразнасці,—ад простага чалавека да вялікага дзеяча. Вобраз Леніна дадзен у развіцці, і гэта—важнейшая заслуга Орлова.

Адна з лепшых сцэн спектакля—сцэна крэмлёўскай набярэжнай. Яна захапляе нас непасрэднасцю, значнасцю, рамантычнасцю.

Ноч... Цьмяна свеціць ліхтар... Ледзь віднеецца Крэмль. Пахаджае Ленін. Ён гаворыць аб Расіі:—«Калі зараз сесці на паветраплавацельны апарат і падняцца над Расіяй, дык у вас халодны пот праступіць. Пад вамі акажацца чорнае бяздонне, велізарная пустыня, дзе прытаіліся напоўдзікія людзі...»

Прыгадваюцца 1920 і 1921 годы— годы разрухі і голаду. Цяплушкі, тыф... І нас мімаволі ахапляе цяжкае пачуццё.

Але вось Ленін гаворыць аб сваёй мары, аб электрыфікацыі краіны. Якая ўпэўненасць чуецца ў яго словах! І верыш, што толькі Ленін мог у такія мінуты марыць аб тым, што не ўкладвалася ў галовах нават самых «перадавых» дзеячоў буржуазнага грамадства.

Вобразы таварышоў Сталіна і Дзяржынскага ў п'есе «Крэмлёўскія куранты» дадзены толькі ў адной карціне і таму з'яўляюцца вялікай трудносцю для выканаўцаў. На невялікім тэкставым матэрыяле акторы павінны стварыць праўдзівыя, запамінаючыяся вобразы правадыроў.

Артыст Ю. Орынянскі, які выконвае ролю Сталіна, спраўляецца з гэтай цяжкай задачай. У сцэне гутаркі Леніна, Сталіна і Дзержынскага з інжынерам Забеліным яму ўдаецца падкрэсліць вайстрыню, яснасць, пераканальнасць сталінскай мыслі і бязмежную любоў да Леніна.

Артыст В. Вінаградаў яшчэ не знайшоў таго галоўнага, што ўнутрана ўласціва Дзяржынскаму, што характарызуе толькі Дзяржынскага. Не адчуваецца абаяльнасці гэтага благароднага чалавека. А таму і вонкавы рысунак вобраза, хоць і метка схоплены, не зусім пераконвае нас.

Ролю матроса Рыбакова выконвае артыст А. Перверцень. Рыбакоў—гэта малады, але моцны большэвік, які разам з іншымі рабіў рэволюцыю, а цяпер заняты соцыялістычным будаўніцтвам. Артыст Перверцень яшчэ не авалодаў гэтай роляй. Тэма кахання Рыбакова да Машы, дачкі інжынера Забеліна,ператвараецца ў яго ў вядучую тэму і гэта вызначае выкананне. Ён вельмі істэрычны, вельмі інтэлігентнічае. Ён неяк вельмі трагічна, ці што, перажывае каханне без узаемнасці. У яго нехапае пачуцця гумару, што адразу-ж надало-б другі акцэнт яго любоўнай тэме. І таму, натуральна, не зусім верыш, што такому чалавеку Ленін мог даверыць адказнейшы ўчастак будаўніцтва—электрыфікацыю.

Удалася роля інжынера Забеліна артысту В. Канаплянскаму. Ён праўдзіва раскрывае вобраз старога інжынера, які не прызнае совецкай улады, сабаціруе яе. Але рэчаіснасць пераконвае яго ў памылцы, і ён пераходзіць на бок совецкай улады. Гэты пераход тэкставым матэрыялам і акторскім выкананнем поўнасцю апраўдан, асабліва пасля спаткання Забеліна з Леніным, Сталіным і Дзяржынскім. Гэта павінна было адбыцца. Але актор яшчэ не напоўніў зместам вобраз Забеліна, пачаўшага працаваць ужо для совецкай улады. Гэта дадзена яшчэ не зусім пераканаўча.

Сур'ёзна трэба папрацаваць яшчэ над роляй англійскага пісьменніка (выконвае засл. артыст БССР Н. Аблаў). Ён павінен быць больш разумным, больш перакананым, тады і перамога і перавага Леніна ў гэтай сцэне, вобраз Леніна яшчэ больш вырастуць.

Цёпла, лірычна выконвае ролю гадзіншчыка, які паладзіў крэмлёўскія куранты, артыст Ю. Трахценберг. Але іншы раз ён траціць пачуццё меры. У некаторых сцэнах ён вельмі сантыментальны. Ролю селяніна Чуднова выконвае артыст І. Позін. Увогуле ён спраўляецца з роляю. У ім ёсць сур'ёзнасць, ураўнаважанасць, але нехапае абаяльнасці. Каля Леніна хацелася-б бачыць больш абаяльнага Чуднова. Масавая сцэна ля Іверскай брамы ў цэлым незадаволі пераканаўчая. Кожнаму вобразу ў паасобку мы верым, але адзінай сувязі між імі не адчуваем. Не ствараецца атмасферы гэтага маскоўскага кутка дваццатых год. Тут яшчэ патрэбна рэжысёрская выдумка. Па-майстэрску ствараюць эпізадычныя ролі акторы Чэмберг (чама з вязанкай), Шкапскі (скептык) і Кукіс (аптыміст).

Мастак Л. Наумава выбрала правільны шлях у рабоце над афармленнем спектакля. Яна, улічваючы драматургічную нястройнасць п'есы, імкнулася да стварэння адзінай тапальнасці спектакля, што павінна было спрыяць яго цэльнасці. І гэта ўдалося ёй.

Апошняя карціна—пуск крэмлёўскіх курантаў пададзена вельмі моцна. Яна як-бы лагічна завяршае ўсё тое, што гаварылася аб Леніне і яго вялікіх справах. Яна перакідвае мост з дваццатых год у сучаснае і будучае. Рэжысёр С. Владычанскі ўдала вырашыў фінал спектакля.

Гадзіншчык і чырвонаармеец ідуць у вежу. На авансцэну, перад велізарнай заслонай, выходзяць Ленін, Сталін, Рыбакоў, Забелін. Ленін хвалюецца. Да шасці гадзін застаецца адна мінута. А раптам куранты не зайграюць! Але вось гучыць першы ўдар, за ім другі, трэці... Крэмлёўскія куранты—«галоўны гадзіннік у краіне»—зайгралі. І, звяртаючыся ў глядзельную залу, Ленін кідае словы, поўныя глыбокай радасці, веры ў будучае: «Гэта вялікая справа, таварышы. Гэта ўжо назаўсёды. Свой крэмлёўскі час яны будуць адлічваць вякамі».

Апошнія словы Леніна пакрываюцца першымі гукамі пролетарскага гімна. Ленін і Сталін ідуць за заслону. Заслона павольна адкрываецца і перад намі— Крэмлёўская сцяна, Спасская вежа. Усё нарастаюць гукі «Інтэрнацыянала». Ленін на Крэмлёўскай сцяне застывае ў знаёмай для нас позе: з працягнутай рукой, з падаўшымся наперад корпусам і вострым позіркам.

Ужо даўно замоўклі гукі «Інтэрнацыянала», а глядач, ахоплены хваляваннем, не можа адарваць вачэй ад гэтай велічнай манументальнай карціны.

Спектакль «Крэмлёўскія куранты»— вялікая ўдача Дзяржаўнага Рускага драматычнага тэатра БССР. Тэатр стварыў спектакль аб Леніне. Але гэта толькі пачатак. Спатрэбіцца яшчэ сур'ёзная, доўгая праца па далейшаму ўдасканаленню спектакля.

Вл. НЕФЕД.



На пасяджэнні праўлення маскоўскага аддзялення Саюза савецкіх архітэктараў былі падведзены вынікі закрытага конкурса на праект будынка для панарамы «Штурм Перекопа», якая будзе адкрыта на месцы геройчнага штурму 1920 года. На конкурс было прадстаўлена 177 праектаў з 30 гарадоў СССР. Першая прэмія ў 12.000 руб. прысуджана за праект маладых маскоўскіх архітэктараў **А. Дзідзенні і А. Генералава. На здымку:** Праект будынка для панарамы «Штурм Перакопа», які атрымаў I прэмію.

Фота Г. Шыракова (ТАСС).

Л. Кобрынскі

Творчыя сілы беларускай эстрады

Трэба строга размежаваць творчых работнікаў мастацтва, называемых эстраднымі акторамі, ад артыстаў, што выступаюць на эстрадзе. Першыя — гэта творчыя работнікі, неразрыўна звязаныя з эстрадай, якія спецыялізіруюцца ў гэтай галіне мастацтва, рыхтуюць для яго рэпертуар. Другія — эстрадныя гастралёры, яны працуюць у іншых творчых прадпрыемствах і выступаюць на эстрадзе досыць выпадкова, у вольны час. Агульнага ў іх з эстраднымі артыстамі толькі сцэнічныя падмосткі, якія называюцца эстрадай.

Эстраднае мастацтва ў многім адрозніваецца ад тэатральнага, оппернага і балетнага, кампіліруючы, але адначасова «пераўтвараючы» у сабе ўсе гэтыя галіны мастацтваў. Але яно мае і агульнае з прыгаданымі мастацтвамі — гэта строгі падбор ансамбля.

Эстрадны калектыў павінен быць падабран так, як і ансамбль тэатра, оперы і балета, сімфанічнага аркестра — у акрэсленых узаемаадносінах творчых сіл.

Дзяржаўная беларуская эстрада мае кадры, з якіх можна стварыць добры эстрадны ансамбль. Камен і Каргашынская, Кусевіцкі і Сяргеева, Юранд, Бірэнбаум, Шышкін, артысты розных галін мастацтваў і розных жанраў, добра гучаць разам на адным канцэрце.

Адсутнічае ў Дзяржаўнай беларускай эстрадзе нацыянальны каларыт, які павінен быць уласцівы нашай эстрадзе, бо цяжка лічыць вырашаным гэта пытанне тым, што на справаздачна-творчым канцэрце быў прачытан адзін беларускі верш і праграма была паказана на фоне дрэнна выпісаных беларускіх арнаментаў.

Пяройдзем к кадрам. Лепшым чытальнікам беларускай эстрады з'яўляецца I. Камен. Але Камен-чытальнік мае свае недахопы. Ім з'яўляецца яго ілюстрацыйная тэхніка чытання. Не будзем тут меркаваць, мае ці не мае права чытальнік дапамагаць сабе мімікай, жэстам, аднак бясспрэчна залішнімі і немастацкімі з'яўляюцца розныя напеўныя і не артыкуліраваныя гукі, якія багата ўжывае Камен. Так, захапляючыся перайманнем джазавых інструментаў і рытму машын, ён згубіў сацыяльны акцэнт верша «Негр Джым». У выкананні іншых твораў згублена яркасць вобраза.

Камен называе сваё чытанне «тэатрам без грыма». Але-ж тэатр патрабуе чоткасці вобразаў і яснасці дзеянняў. Камен актор вельмі адароны, вялікага тэмпераменту і дыяпазону, і мы з жалем наглядаем, як растрачвае ён свой талент на выкананне такіх недасканалых ці проста дрэнных твораў, як «Шанхай». У яго выкананні Швейк з вялікага твора Гашака артымліваецца толькі «спрытным і пацешным». А Камен, на нашу думку, здольны паказаць гэты вобраз ва ўсёй яго шматграннасці і красачнасці. Камен— чытальнік вялікіх магчымасцей. Нам здаецца, што ён можа быць адным з лепшых чытальнікаў класікі на нашай эстрадзе.

Артыст Бірэнбаум паказаў сябе на справаздачна-творчым канцэрце беларускай эстрады ў двух планах: як чытальнік сур'ёзных нумараў і — гумарыстычных. Як у першым, так і ў другім плане ён вылучаецца культурай выканання. Проста, непрымусова, імкнучыся асэнсаваць чытаемы твор, выступае Бірэнбаум перад сваім гледачом. Але старанны аналіз тэкста, нажаль, не спалучаецца ў яго з выразным выкананнем, уменнем раскрыць асаблівасці твора. Напрыклад, чытаючы урыўкі з твораў Пушкіна, Тургенева, Бялінскага, Маякоўскага, ён не здолеў паказаць своеасаблівасці гэтых аўтараў.

Выступленне Бірэнбаума ў гумарыстычным плане было больш удалым.

Артыстка Новік з вялікай непасрэднасцю чытае фрагмент з твора Горкага «Маці». Перад намі ўстаюць хвалюючыя сцэны, насычаныя вялікім драматызмам апошніх старонак незабыўнага твора Горкага. Але не здолела яна стварыць дакладных вобразаў дзеючых асоб. Не ўсюды ясна праводзіць яна дзеянне. Непасрэднасць — вялікі дар чытальніка. Але толькі непасрэднасць не можа ўсё вырашыць. Стварэнне атмасферы, музыкі дадзенага твора немысліма па-за жывымі вобразамі дзеючых асоб. А вось іх чытальнік Новік не стварыла.

Адным з самых моцных жанраў Дзяржаўнай беларускай эстрады з'яўляецца вакальны. Каргашынская добрая выканальніца народных жартлівых песень. Калі-б яна адмовілася ад банальнага неўласцівага добрай спявачцы наігрышу, яна здолела-б з вялікім поспехам культывіраваць гэты жанр на нашай эстрадзе.

Кац — спявачка, якая валодае добрымі галасавымі данымі і значнай культурай выканання. Песні і рамансы яна выконвае з вялікім мастацкім тактам.

Кусевіцкі заваёўвае ўвагу выдатным голасам. Але не ўсюды ён выкарыстоўвае яго з неабходнай памяркоўнасцю. Рэпертуар Кусевіцкага павінен быць перагледжан, папоўнен сапраўднымі народнымі песнямі.

Сяргеева выконвае жанравую песеньку. Яна — адна з самых маладых артыстак нашай эстрады. Яе жанр цікавы і своеасаблівы, і трэба прызнаць, што Сяргеева добра з ім спраўляецца. Шмат прастаты і непасрэднасці ў яе выкананні.

Самым адсталым участкам беларускай эстрады з'яўляецца танец. Народныя танцы, паказаныя на справаздачна-творчым канцэрце, сведчаць аб адсутнасці сур'ёзных адносін кіраўніцтва эстрады да гэтага важнага жанру. Касцюмы да гэтых танцаў былі падабраны няграматна. Ад выканальніц гэтых танцаў мы ўпершыню даведаліся, што к фігурам народных танцаў прымічваецца сальто. Другі танец, выкананы Хонес і Вайнберг, мае вельмі мала агульнага з «мастацтвам Тэрпсіхоры». Аднак, танцоркі маюць пэўнае дараванне, а Хонес з'яўляецца танцоркай са стажам і са спецыяльнай адукацыяй.

Доказам беспрытульнасці танца на эстрадзе з'яўляецца і нумар Спальтэра — імправізацыя пад назвай «Чарлі Чаплін». Капіраваць Чапліна вельмі цяжка і не дабрацца да яго пры дапамозе бамбукавай палачкі і вялікіх башмакоў. Чаплін не фокуснік, не жанглёр і не эксцэнтрычны дзівак. Тое смешнае, што ў ім ёсць (а смешнага ў ім нямала!), з'яўляецца толькі вонкавым акцэнтам яго вялікіх жыццёвых пакут. Апрача вялікай мыслі, уласцівай ігры Чапліна, ёсць у ім шмат цеплыні і лірызму, якія робяць яго блізкім і дарагім мільёнам гледачоў усяго свету.

Спальтэр «дабіраецца» к Чапліну пры дапамозе палачкі і башмакоў. Але нават і гэта мала яму ўдаецца, бо ён не мае на мэце пэўнага добра задуманага эпізода, ён няўмела імправізіруе на цяжкую тэму.

Ёсць яшчэ адзін жанр танца на нашай эстрадзе, так-званы «стэп» — рытмічны танец. Гэты танец больш захапляе вуха, чым вока гледача. Нусенбаум і Найфельд з'яўляюцца нядрэннымі выканаўцамі гэтага жанру, але тэмы, задуманыя імі (чалавек і машына), не падыходзяць да яго.

Дзяржаўная беларуская эстрада мае цікавы маленькі калектыў—«джаз-гол» (галасавы джаз) пад кіраваннем Юранда, які карыстаецца вялікім поспехам на ўсіх канцэртах.

Баяніст Шышкін з вялікім майстэрствам выконвае народныя і класічныя творы, адначасова з'яўляючыся добрым мантажыстам рускіх народных песень.

Сярод канцэртмейстраў беларускай эстрады трэба адзначыць Хонеса і Капусцінскага.

Але ўсе творчыя сілы эстрады патрабуюць мастацкага кіраўніцтва, здольнага з гэтага калектыва адароных выканаўцаў стварыць высокамастацкі ансамбль эстраднага тэатра.

Кіраваць эстрадай як мастацка, так і адміністрацыйна — справа надзвычай складаная па двух меркаваннях. Па-першае, эстрада сумяшчае розныя віды мастацтваў, па-другое, партатыўнасць эстрады дае ёй магчымасць абслужыць велізарную колькасць пляцовак і гледачоў. Але калі першае пытанне, якое вынікае з сумяшчэння розных відаў мастацтваў, можа быць вырашана запрашэннем кансультантаў для дапамогі мастацкаму кіраўніцтву, дык пытанне абслугоўвання шырокага гледача стварэннем брыгад і праграм з'яўляецца справай не толькі складанай, але і вельмі адказнай.

Эстраднае мастацтва з'яўляецца не толькі больш партатыўным, чым іншыя віды мастацтваў — тэатр, опера і балет, але і куды больш паваротлівым у сэнсе складання рэпертуару, у якім-бы адлюстроўваліся ўсе важныя падзеі дня. Стварэнне брыгад для абслугоўвання калгаснай вёскі, вайсковых часцей, гледача новых раёнаў з'яўляецца справай вялікай ідэйна-выхаваўчай важнасці і ёй нельга займацца «спрытным дзяльцам» ці «мастацкім кіраўнікам-акадэмікам», — за гэта трэба ўзяцца творчым і адміністрацыйным работнікам эстрады, непарыўна звязаным як з мастацтвам, так і з жыццём.

СПЕКТАКЛІ БАРАНАВІЦКАГА ТЭАТРА

Баранавіцкі абласны драматычны тэатр малады. Як абласны тэатр, ён існуе ўсяго год, а перад тым калектыў яго каля чатырох год працаваў у якасці калгасна-соўгаснага тэатра ў Рагачове.

У Баранавічах у часы панскага ўладарання стацыянарнага тэатра не было. Гэта быў глухі правінцыяльны гарадок.

Такім чынам, на долю Баранавіцкага абласнога драматычнага тэатра выпала ўдзячная роля выхавання новага гледача на творах мастацтва, быць прапагандыстам савецкага мастацтва.

Год работы ў новых умовах непазнавальна змяніў творчае аблічча тэатра. Гэтаму спрыяў маштаб работы — сцэна гарадскога тэатра, патрабаванні гледачоў, што дало новае сцэнічнае жыццё нават спектаклям старога рэпертуару, узняло іх мастацкую вартасць.

«Егор Булычоў і іншыя»—стары спектакль тэатра. Але ён не падобны на той спектакль, які мы бачылі ў Мінску ў часе фестываля калгасных тэатраў. Гэтаму

Арт. **Б. Савіч** у ролі Панталонэ («Слуга двух паноў»).

Зарысоўка Е. Гаробчанкі.

спрыяе ўдасканаленне ігры актораў Г. Свірчэўскага (Егор Булычоў), М. Касой (Глафіра), Н. Шкалярэнкі (Варвара), Н. Васілеўскага (поп Паўлін), М. Андрэевіч (Малання). Спектакль гэты цяпер больш яркі, мастацка спелы.

Г. Свірчэўскі ў Егору Булычову раскрывае характар асуджанага на пагібель прадстаўніка буржуазіі, але разумнага чалавека, з моцнай воляй, які грэбуе рэлігійнымі забабонамі, буржуазнай мараллю, выкрывае іх.

З поспехам выступіла ў ролі Глафіры маладая актрыса М. Касая. За кожным словам і рухам Глафіры адчуваецца сіла чалавека, які ведае, што праўда на яго баку.

Вобразы папа Паўліна і настаяцельніцы манастыра Маланні родніць ханжаства гэтых «служак божых», якія — першы за палітыканствам, другая за паказной набожнасцю — хаваюць сапраўдны твар людзей, прагных да багаццяў, да ўласнага дабрабыту, нажывы. Такімі іх і іграюць Н. Васілеўскі і Н. Шкалярэнка.

Заслуга пастаноўшчыка спектакля А. Лізункова і выканаўцаў ролей у тым, што яны правільна раскрываюць замысел М. Горкага, паказваюць усю непрыглядльнасць буржуазнага асяроддзя.

Адной з апошніх работ тэатра з'яўляецца спектакль «Слуга двух паноў» К. Гальдоні, пастаўлены мастацкім кіраўніком тэатра Б. Н. Нахімавым-Дольскім. Гэты спектакль вылучаецца і культурай пастаноўкі і добрай ігрой актораў. Ён красачны, лёгка ўспрымаецца гледачом. Ён даносіць да гледача прыгажосць гальдоньеўскай камедыі.

З выканаўцаў перш за ўсё хочацца адзначыць А. Блажэвіча (Брыгело). А. Блажэвіч — вопытны актор. Але яго акторскай рабоце на працягу значнага часу была ўласціва схематычнасць. У спектаклі «Слуга двух паноў» А. Блажэвіч ідзе па лініі ўнутранага раскрыцця вобраза. Брыгело прадстае перад гледачом тыповым носьбітам хітрасці і каварства, чалавекам, які нічым не грэбуе ў імя ўласнай карысці.

Б. Савіч (Панталонэ) і Е. Гаробчанка (Сільвіо) таксама дасканала вядуць свае ролі.

Н. Васілеўскі іграе ролю Фларынго — юнака, які пакінуў на радзіме сваю каханую. Адсутнасць вестак аб любімай прымушае яго смуткаваць, упадаць у роспач. Перадаць гэтыя пачуцці так, каб у іх паверыў глядач, актору не заўсёды ўдаецца. Актору нехапае любві да вобраза, які ён стварае. З залішняй мітуснёй зроблена сцэна спробы Беатрычэ (Н. Шкалярэнка) і Фларынго пакончыць самагубствам. На мой погляд, гэта сцэна патрабуе дапрацоўкі.

Добра іграе Б. Талпега. Яго Труфальдзіно кемлівы і лоўкі слуга, які «сам сабе на вуме». З жаночых вобразаў найбольш удалы — Сміральдзіна (М. Юдзіна). Гэту ролю актрыса вядзе вельмі жыва і непасрэдна.

У чым можна папракнуць амаль усіх актораў, гэта ў адсутнасці культуры мовы і безуважнасці да яе.

Такім чынам, першы крок у напрамку стварэння абласнога драматычнага тэатра не на назве, а па сутнасці зроблен. Трэба спадзявацца, што за «Слугою двух паноў» паследуюць новыя спектаклі, якія прынясуць тэатру новыя творчыя радасці, заслужаны поспех.

Арт. Б. Талпега ў ролі Свірчка («Сады цвітуць»).

Зарысоўка Е. Гаробчанкі.

Цяпер тэатр працуе паралельна над двума п'есамі: «Чужое дзіця» і «Непакойная старасць». За імі паследуе пастаноўка п'есы «Любоў Яравая». У рэпертуарны план таксама ўключаны: «Севільскі цырульнік» Бомаршэ, «Забаўны выпадак» Гальдоні і «Праз 20 год» Святлова. Гэта —план вялікі і адказны.

С. НОРТМАН.

АБМЕРКАВАННЕ ПРАЕКТАЎ ПОМНІКА

Выстаўка конкурсных праектаў помніка ў гонар вызвалення Заходняй Беларусі перанесена з Опернага тэатра ў Дом урада. 11 кастрычніка адбылося абмеркаванне праектаў, а 15 кастрычніка крытычнаму разбору выстаўленых работ была прысвечана спецыяльная нарада скульптурнай секцыі Саюза савецкіх мастакоў БССР.

Спрэчкі на гэтых нарадах былі згуртаваны, галоўным чынам, вакол праектаў М. Керзіна, А. Глебава, Н. Рапапорта і праекта, паступіўшага пад дэвізам «Чырвоная звязда». Мастакі Л. Кроль, Б. Малкін, Е. Красоўскі, А. Бразэр выказаліся за праект Н. Рапапорта, які на іх думку найбольш поўна выражае ідэю вызвалення Заходняй Беларусі ад іга польскіх паноў і народнае лікаванне ў сувязі з гэтым вызваленнем. Жывапісец В. Волкаў, архітэктары П. Кірыенка і Е. Пінінская выказаліся за праект М. Керзіна, архітэктар Р. Столер — за праект А. Глебава.

У бліжэйшыя дні адбудзецца пасяджэнне журы конкурса.

У кінотэатрах Мінска «Чырвоная Звязда» і «Радзіма» дэманструецца новы мастацкі фільм «Светлы шлях» рэжысёра Г. Аляксандрава з удзелам засл. артысткі РСФСР **Л. Орловай. На здымку:** Кадр з фільма.

Пісьмы ў рэдакцыю

МУЗЕЙ, ЯКІ ІСНУЕ... Ў ВЕДАМАСЦІ

Загадчыца рэчыцкім краязнаўчым музеем тав. Бер любіць расказваць аб тым, што яна... «скончыла вышэйшую школу мастацтва ў Ірландыі».

Але прывядзём некалькі фактаў, якія ілюстрыруюць сапраўдны культурны ўзровень тав. Бер, вылучанай рэчыцкімі раённымі арганізацыямі ў музеязнаўцы.

Нядаўна ў гутарцы з маладым мастаком К-м, які заканчвае акадэмію мастацтваў у Ленінградзе, яна прасіла яго зрабіць для музея рэчыцкі пейзаж «80 год таму назад», тлумачачы гэта так:

— Днепр за гэтыя годы, наколькі мне вядома, рэчышча не мяняў. Таму вы сядзеце на тым баку Днепра і зробіце накід гарадскога парка, а ў цэнтры яго з-за дрэваў павінна выглядваць якая-небудзь вежа...

Улетку гэтага года раённая газета пісала аб вышыўках калгасніцы Любы Герасенка з калгаса імя Фрунзе. Па багаццю нацыянальных матываў, па спалучэнню тонаў, па стараннасці выканання вышыўкі гэтыя выклікаюць захапленне гледача.

Прачытаўшы артыкул, тав. Бер усміхнулася:

— Не выязджаючы ў калгас імя Фрунзе, сцвярджаю, што гэта не беларускія народныя матывы. Узоры вышывак, мусіць, зрысаваны ў нейкай памешчыцы...

На сродкі, асігнуемыя музею, не набыта ні аднаго экспаната, характарызуючага творчасць беларускага народа. На працягу двух год існавання музея тав. Бер не зрабіла ні аднаго выезда ў калгасы, не пазнаёмілася сур'ёзна і глыбока з мясцовымі прадпрыемствамі, не стварыла актыва з асяроддзя вучняў і настаўнікаў, краязнаўцаў-энтузіястаў, якіх у Рэчыцкім раёне і ў самой Рэчыцы нямала.

Спадзяемся, што Народны камісарыят асветы БССР зацікавіцца дзейнасцю рэчыцкага краязнаўчага музея. Гэта тым больш неабходна, што два годы музей існуе ў якасці «паветранага палаца», які фігурыруе толькі ў ведамасцях на зарплату яго супрацоўнікам. Два годы ён з'яўляецца пасынкам рэчыцкай цэнтральнай бібліятэкі, дзе яму вызначан пакой, у якім дасюль не захоўваецца ні аднаго экспаната.

М. ВОЛАХАЎ.

Рэчыца.

ТЭАТР БЕЗ ГАСПАДАРА

Бабруйск мае тэатральнае памяшканне на 1.170 месц, пабудаванае на сродкі Гарсовета ў 1933 годзе.

Памяшканне гэта з'яўляецца гаспадарча-разліковай адзінкай. Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР успамінае аб ім толькі тады, калі неабходна ў парадку размеркавання гастролей тэатраў знайсці пункт для работы. У астатнім Бабруйскі тэатр Упраўленне не цікавіць. Між тым, тэатру неабходны сродкі на даабсталяванне яго, на сканчэнне электрычнага абсталявання сцэны.

Абласны аддзел мастацтваў унёс прапанову аб пераводзе Бабруйскага тэатра на абласны бюджэт, пры ўмове невялікай штогодняй датацыі яму, альбо аб перадачы яму для эксплаатацыі летняга гарадскога саду. У гэтым выпадку ніякіх затрат, ніякіх датацый не было-б патрэбна. Але і тут справа затармазілася.

Так ці інакш, але гаспадар для тэатра павінен быць знойдзен. **Г. КАЛАТНОВЕР.**

Магілеў.

У комсамольскай арганізацыі ССП БССР

Днямі адбыўся справаздачна-перавыбарчы сход комсамольскай арганізацыі Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР.

Сход ускрыў у рабоце комсамольскай арганізацыі рад буйных недахопаў. Комсамольцы слаба працавалі над авалоданнем асновамі марксізма-ленінізма, слаба ўдзельнічалі ў гутарках па гісторыі партыі і тэарэтычных канферэнцыях, якія арганізоўваліся партарганізацыяй Саюза пісьменнікаў. Творчасць пісьменнікаў-комсамольцаў тт. Груб'яна, Мальцінскага і інш. ні разу не абмяркоўвалася на сходах арганізацыі. Не вялося работы з пачынаючымі пісьменнікамі. Дрэнна была пастаўлена ваенна-абаронная работа сярод комсамольцаў.

Сход прыняў пастанову, у якой гаворыцца аб неабходнасці перабудаваць работу комсамольскай арганізацыі на аснове рашэнняў XIV з'езда ЛКСМБ. Больш сур'ёзна трэба заняцца творчасцю пісьменнікаў-комсамольцаў, ідэйна-палітычным выхаваннем маладых пісьменнікаў.

Прыняты канкрэтныя прапановы аб прыцягненні ўсіх комсамольцаў да глыбокага вывучэння «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Сход адзначыў творчую работу комсамольцаў-пісьменнікаў. Тт. Мальцінскі і Шведзік напісалі новыя творы, тав. Груб'ян падрыхтаваў да друку зборнік вершаў. Пры актыўным удзеле комсамольцаў-пісьменнікаў выпушчан літаратурна-мастацкі зборнік да XX-годдзя ЛКСМБ.

Тайным галасаваннем сакратаром комсамольскай арганізацыі Саюза пісьменнікаў БССР выбран тав. Кучар.

М. М.

М. Даніленка

НЕРВЫ

Апавяданне

Каб не быў Арцём такі гарачы, ды каб не тыя меліяратары, можа і не здарыўся-б з ім і з брыгадзірам Федзькам непрыемны выпадак. Праўда, сварка тая, як кажуць, не ішла і не ехала, але ўсё-такі дзядзьку Арцёму выйшла непрыемнасць.

А здарылася гэта ўжо напрыканцы лета, калі апошняе жыта звозілі.

Пасля абедзенага перапынку забег за Арцёмам брыгадзір Федзька. Перад Арцёмам ён апошнімі днямі неяк трусіў, і ўсё праз чарнявую Арцёмаву Любку. Што любіць яна брыгадзіра маладога, Арцём, мусіць, ведаў, але-ж Федзьку трэба-б пагаварыць з будучым цесцем, а асмеліцца на гэта Федзька не мог.

Таму і зараз, стараючыся не сустракацца з позіркам Арцёма, Федзька заспяшаўся:

— Там, каля «Болахава кліна», дзве капы жыта засталося. Трэба іх прывесці, а вечарам дажынкі справім... З'ездзіце, дзядзька, забярыце. Ды спяшайцеся: штосці парыць здорава, каб хаця дажджу не было...

— З'ездЖу, — коратка адказаў Арцём, умацоўваючы рубель на калёсах. — А вечарам дажынкі, кажаш?

— Ага. І праўленне-ж павінна быць.

Арцём выкаціў на вуліцу калёсы і паглядзеў услед Федзьку.

— Добры-б зяць быў, ліха яго...—хаваючы ўсмешку ў рыжаватых вусах, услых падумаў ён. — Нешта-ж прыглядаецца ён да Любкі... Але няхай. Маладыя, чаго там... Грышка, а, Грышка! — пагукаў ён сына. — Што-ж ты сядзіш усё на гародзе? Не зрывай кавуноў, збегай лепш на стайню па варанога.

Грышка хуценька запхнуў вялікі паласаты кавун пад шырокі гарбузны ліст і гародамі паімчаўся к калгаснаму двару. І пакуль Арцём падмазаў колы, ён ужо вярнуўся з вараным.

— Тата, і я паеду. Снапы падаваць буду.

— Спраўлюся адзін. Глядзі вось курэй, каб у ячмені не гаспадарылі.

Арцём запрог каня, узяў па прывычцы пугу і выехаў за вёску.

«Болахаў клін» зараз не быў клінам, яго называлі так па старой памяці. Ды і які можа быць клін тут, калі, як мог чалавек акінуць вокам, жаўцела васковае іржышча ад вёскі аж да віднеўшагася здалёк хвойніку.

Было парна.

Арцём адганяў назойлівых сляпнёў ад варанога, выціраў выступаўшы на твары пот. Цмокаў языком на каня.

— Но, дружок, каб табе добра было... Пад альховым кустом адзінока стаялі дзве капы жыта. Падвярнуўшы каня, Арцём адвязаў рубель і саскочыў з калёс. Толькі цяпер ён заўважыў, што пад адною капой сядзелі два чалавекі.

— Здарова, людзі, — аглядаючы іх, прывітаўся Арцём.

— Дзень добры, — адказаў старэйшы, падносячы да казырка кепкі руку.

«Няйначай гарадскія», — падумаў Арцём, убачыўшы ёмкі чамадан і доўгі трыножнік, што вытыркаўся з-за капы.

— Выбачайце, таварыш, — звярнуўся старэйшы к Арцёму, — адарвацца ад працы на хвіліну вы не можаце? Мы меліяратары. Кіравалі асушкай балота ў суседнім сельсовеце, а ў раёне рашылі іспі напрамкі. Тут-жа балота ў вас...

— Зараз пакажу сцежку, — адказаў Арцём. Ён распрог каня і пусціў яго ў гушчар маладога хвойніку. Людзі падняліся. Маладзейшы ўзяўся за чамадан, старэйшы — за трыножнік і рушылі за Арцёмам.

— Гэта наша балота даўно ўжо трэба было асушыць, — гаварыў Арцём. — Мы і самі збіраліся, ды жніво наступіла, прыйдзецца хіба налета.

— Чаму-ж вы так слаба збіраліся?— пачуўся ззаду голас маладзейшага меліяратара. Арцёму здалося што на слове «слаба» меліяратар зрабіў націск.

— А вы думаеце, што мы да касавіцы сядзелі, склаўшы рукі? Мусіць-жа нешта рабілі, калі часу не знайшлі. Перш-на-перш, збудавалі новы свінарнік на 80 свіней, потым калгасны вадаём закончылі, а там яшчэ і птушкаферму арганізавалі. Як бачыце, не спалі.

Тугое спляценне івавых галін навісала над ледзь заметнай сцежкай. Каб не зачапіцца, Арцём папярэджваў:

— Глядзіце, тут галлё. Асцярожней.

Мінулі круглую азярыну. У ёй яшчэ трымалася вада, пакрытая зялёнай сеткай вадзяных траў.

— Ну, тут вы ўжо і самі патрапіце. Далей дарога будзе выразней відаць. Пройдзеце па Тонеж, — вёска тут, — а там спытайце дарогу на Тураў.

Меліяратары падзякавалі і хутка зніклі за альховымі зараслямі.

Арцём вярнуўся назад.

«Такі нездарма парыла зранку»,—думаў ён, гледзячы на шэрую хмару, якая адразу пачала засланяць сонца: «Каб хаця дождж не лінуў, а то будзе бяды».

Але дождж пайшоў, — спачатку радкі, буйны, халодны. Гучна зашалясцеў па лісцю арэшніка. Арцём пабег па сцежцы.

«Лепш-бы не вёў іх дасюль...»—падумаў. Ужо выбегшы з хвойніку, ён убачыў Федзьку, які клаў на воз снапы, хоць конь яшчэ не быў запрэжан.

— Эх, вы! Вас-жа паслалі, як добрага чалавека,— усхвалявана паматваў бялявым чубам Федзька.

— А ты што? Можа, за гультая мяне лічыш, думаеш—спаў? Па-твойму, чалавеку нельга сцежкі паказаць?

Ці не пачуў з-за дажджу Федзька апошніх Арцёмавых слоў, ці не хацеў іх чуць, толькі выпраміўся і са злосцю адказаў:

—Факт той, што вы не прывезлі жыта, дзядзька. Сярдуйце ці не, для мяне ўсё адно.

Арцём адчуў, як у сэрцы загарэўся агеньчык злосці. Ён хацеў стрымацца, але не змог і вызверыўся на Федзьку:

— Папрацаваў я больш за цябе, блазнюка зялёнага. Згары ты тут з усім! Вязі сам гэта жыта...

Выкрыкнуў і пайшоў у вёску.

«Як праца якая, дык усё Арцём ды Арцём, а ледзь адвярнуўся — ужо гультаём лічаць. Блазнота!» Ішоў, зрываў з дарогі адзінокія сцяблінкі высокіх канаплін, не адчуваючы халоднага дажджу, які шумеў па іржышчы.

І калі адышоў даволі далёка, азірнуўся. Федзька ўжо запрог каня і выязджаў на дарогу.

— Прывязе і сам...

А вечарам у калгасным клубе — прасторным будынку з двума ганкамі, увітымі плюшчам і дзікім вінаградам, — засядала праўленне. Успацелы Арцём не мог усядзець на месцы. «Чорт-жа даў увязацца ў сварку тую. Не стрымаўся, стары дурань», — думаў ён. За сталом сядзела ўсё калгаснае праўленне: кругленькі старшыня з бліскуча паголенай галавой, Федзька і яшчэ тры брыгадзіры. Калгаснікаў было мала: прыйшлі толькі па справах, астатнія рыхтаваліся к дажынкам. «Добра, што хаця людзей малавата», — абціраючы хусцінкай пот, думаў Арцём.

— Цяпер пяройдзем да апошняй справы, — прыжмурыўся вясёлы старшыня. — Вы, дзядзька Арцём, папрацавалі нядрэнна. Адпачыць-бы вам зараз, а?

— Вядома, адпачыць, — уставіў слова Федзька, бачачы, як разгубіўся дзядзька Арцём.

— Ну, значыць, мы, наш калгас, пасылаем вас у дом адпачынку, у Крым, к мору. З'ездзіце, адпачніце.

За сталом, прыгладжваючы бялявы чуб, смяяўся Федзька.

— Душна як, проста пот выступае, — не да ладу гаварыў Арцём.

Як ішлі ўжо спраўляць дажынкі, Федзька падышоў к Арцёму.

— Не віню я вас. Не разабраўся, дзе былі, і — давай сыпаць, а вы таксама не стрымаліся.

— Нервы, нервы ў мяне... — усміхаючыся, лагадней Арцём.

— Вось і падлечыце свае нервы, на месца паставіце.

Федзька пакіраваў да калгаснага парку. Там спявалі дзяўчаты. Запявала Любка.

«Добры-б зяць быў, ліха яго...» — яшчэ раз падумаў Арцём.

У той-жа вечар Федзька пагаварыў з будучым цесцем.

Калгас «Гомельскі пралетарый» Лоеўскага раёна.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У3573 Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76. Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва.